Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 9 1933 г. СЕРАДА № 174 (4718) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—У авангард барацьбы за ўборку і збожжаздачу. П. САХАРАВА—Партарганізацыя Беларусі на чыстцы (2 стар.). Х. ДУНЕЦ—Змагацца за савецкі рэпэртуар (3 стар.).

ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ УБОРКІ ЗАСТАЮЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМІ. (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА. Утрымаць заваяванае пяршынства, вывесьці раён у рады перадавых па ўборцы і пастаўцы збожжа дзяржаве—абавязак бальшавікоў слуцкай партарганізацыі (2 стар.).

Тав. Любімаў на прадпрыемствах Віцебску і Гомелю (3 стар.).

ЗА МЯЖОЮ:

Да савецка-пэрсыдзкіх гандлёвых адносін (4 стар.).

Забастовачны рух у краінах капіталу (4 стар.).

Англа-французкі пратэст супроць германскай прапаганды ў Аўстрыі (4 стар.).

ТЭМПЫ і ЯКАСЬЦЬ УБОРКІ ЗАСТАЮЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМІ

Бальшавіцкай рэалізацыяй пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК забясьпечым посьпех уборкі і збожжаздачы, заваюем пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю

У авангард барацьбы за ўборку і збожжаздачу

Стуцзеньскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б паставіў задачу рашучага ўдыму сельска-гаспадарчай вытворчасьці, арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацаваньня калгасаў.

Гэта а усёй вострасьцю патрабавала і патрабуе ўсямернага ўмацаваньня вясковай партыйнай арганізацыі, узмацненьня партыйнага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, бо «калгасны лад, гаворыць тав. Сталін, не зьмяншае, а павялічвае клопаты і адказнасьць партыі і ўраду ў адносінах развіцьця вельскай гаспадаркі», бо «партыя, калі яна жадае кіраваць калгасным рухам, павінна ўваходзіць ва ўсе дэталі калгаснага жыцьця і калгаснага кіраўніцтва».

У адпаведнасьці а гэтай задачай партыя правяла вялізарнейшую работу, накіраваную на ўмацаваньне партыйнага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Арганізацыя палітаддзелаў, МТС і саўгасаў, умацаваньне кадраў партработнікаў на вёсцы — усё гэта вызначыла паварот сельскіх партыйных ячэек да сельска-гаспадарчай вытворчасьці і ўзьняла якасьць партыйнага кіраўніцтва калгасамі, узьняла піянасьць партыйных ячэек на рашучае ачышчэньне калгасаў, саўгасаў і МТС ад кулацкіх, клясава-чужых і апартуністычных элементаў.

І калі веснавую сяўбу гэтага году мы скончылі значна раней, чым у мінулым годзе, пры лепшых якасных паказальніках, то гэта ёсьць рэзультат правядзенных партыяй мерапрыемстваў, рэзультат узмацненьня партыйнага кіраўніцтва сельскай гаспадаркай.

КП(б)Б у гэтым годзе дабілася посьпехаў у справе ўзьняцьця сельскай гаспадаркі. Веснавую сяўбу БССР скончыла на 20 дзён раней. Рад партыйных арганізацый паказалі шырокіх уборы кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Слуцкая партарганізацыя ўмелай расстаноўкай партыйных сіл, умелай арганізацыяй беспартыйнага калгаснага актыву, апэрацыйным кіраўніцтвам ходу сяўбы забясьпечыла пяршынства раёну ў веснавой сяўбе і заваявала пераходны сьцяг КП(б)В. Добрыя прыклады бальшавіцкай барацьбы за сяўбу паказалі Чырвона-Слабодзкая, Шклоўская і рад іншых партарганізацый, хоць падкрэсьліваем, што КП(б)Б далёка ня выкарыстала ўсіх магчымасьцяй, бо мы мелі ў наяўнасьці ўсё неабходнае для таго, каб сяўбу скончыць значна раней і лепш.

Аднак, ход уборкі паказвае, што многія партыйныя арганізацыі ня здолелі замацаваць нават тых дасягненьняў, якіх яны дабіліся ў часе веснавой сяўбы.

Той факт, што ні адзін раён ня скончыў яшчэ ўборкі ў вызначаныя партыяй і ўрадам зусім рэальныя тэрміны, надзвычай ярка гаворыць аб тым, што многім перамогі ў веснавой сяўбе «закружылі галаву», што многіх яшчэ заядае кампанейшчына, дэкларацыйнасьць, пустая мітусьня. Работа рыўкамі, налётамі ў радзе раёнаў замяняе ўпорнае сыстэматычнае партыйнае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15-га чэрвеня патрабуе арганізацыі ў калгасах моцных вытворчых ячэек, цесна зьвязаных з калгаснымі масамі, якія прымаюць непасрэдны ўдзел у вытворчасьці і штодзенна кіруюць вытворчым жыцьцём калгасаў.

Зараз ва ўсіх раёнах БССР праходзіць рэарганізацыя партыйных ячэек у адпаведнасьці з гэтай пастановай. Але вымест і тэмпы перабудовы на сёньня яшчэ яўна неўстарчальныя. Па сутнасьці большасьць райкомаў і ячэек КП(б)Б не арганізавалі партыйную работу ў ячэйках так, каб ахапіць партыйным уплывам, партыйным кіраўніцтвам усе вучасткі работы калгасаў, саўгасаў, каб добра ведаць тэхніку калгасных вытворчасьці, ведаць усе «дробязі» калгаснага жыцьця.

Чаму, напрыклад, Слуцкі р-н, які выпраў пераможцай у часе веснавой сяўбы, адстае ва ўборцы і на 6 жніўня ўборачны плян выканаў толькі на 49,5 проц.? Ці-ж зьмяніліся ўмовы работы на Случчыне, ці мо' зьявіліся тут якія-небудзь новыя «аб'ектыўныя» ўмовы? Бязумоўна, не.

Матар'ял, які мы сёньня зьмяшчаем аб рабоце ячэек калгасу «Гігант» і імя т. Сталіна, Слуцкага раёну, з усёй перакананасьцю паказвае нам, што такіх аб'ектыўных прычын няма. Практыка работы ячэйкі калгасу «Гігант» паказвае, што калі ў калгасе, калі ў брыгадзе кіруюць так, як належыць бальшавікам, дык гэтыя калгасы, ў вызначаныя партыяй тэрміны скончылі ўборку азімых, арганізавалі абмалот і здаюць дзяржаве прадукцыю.

Прычына адставаньня Слуцкага раёну, як і астатніх раёнаў БССР, у тым, што далёка ня ўсе парт'ячэйкі здолелі замацаваць той вялізарнейшы творчы энтузіязм калгасьнікаў, тую вялізарнейшую мабілізаванасьць, якая была ў часе веснавой сяўбы. Прычына ў тым, што большасьць парт'ячэек хоць фармальна і перабудавана, а па сутнасьці партыйна-масавая работа на полі, у брыгадзе, у зьвяне яшчэ не адчуваецца.

Пасьля рэарганізацыі тэрытарыяльных ячэек Слуцкая вясковая партарганізацыя прыняла такі выгляд: арганізавана 5 калгасных вытворчых ячэек, 11 кандыдацкіх груп і 41 партыйна-камсамольскіх ядраў. Апрача гэтага ў тых калгасах, дзе няма камуністаў, вылучаны 91 партарганізатар а гарадзкой партыйнай арганізацыі і з тэрытарыяльных ячэек.

Гэта рэарганізацыя ў радзе месц ужо дае значны эфэкт у справе ўмацаваньня партыйнага кіраўніцтва ходам уборкі. Задача партыйных ячэек заключаецца ў тым, каб бяз усякай «раскачкі» здолець адразу-ж арганізаваць бальшавіцкае кіраўніцтва ўборкай, арганізаваць малацьбу і пастаўку збожжа дзяржаве. Трэба навесьці сакрушальны ўдар на кулацкай дзейнасьці, накіраванай на тое, каб бяз усякай «раскачкі» здолець адразу-ж арганізаваць бальшавіцкае кіраўніцтва ўборкай, арганізаваць малацьбу і пастаўку збожжа дзяржаве. Трэба навесьці сакрушальны ўдар на кулацкай дзейнасьці, накіраванай на тое, каб расьцягнуць уборку, сарваць яе якасьць, сапаваць, раскрасьці ўраджай, сарваць дзяржаўныя пастаўкі. А такая дзейнасьць моцна адчуваецца ў радзе калгасаў.

Пры гэтым ні на адну мінуту нельга забываць, што «сіла бальшавікоў, сіла камуністаў заключаецца ў тым, што яны ўмеюць акружаць нашу партыю мільёнамі беспартыйнага актыву» (Сталін). Умець арганізаваць вырашы калгасны актыў, абаперціся на яго ва ўсёй нашай рабоце, мабілізаваць яго на хутчэйшае аканчэньне ўборкі — у гэтым задача слуцкіх бальшавікоў, у гэтым задача ўсёй КП(б)Б.

У гэтай сувязі надзвычай важна падкрэсьліць задачу арганізацыі груп спачуваючых у калгасах са спэцыяльна-прымацаванымі да іх партарганізатарамі. Работа з актывам і групамі спачуваючых, якія зьяўляюцца моцным рэзэрвам партыйных арганізацый на вёсцы, павінна заняць важнае месца ў рабоце партыйных арганізацый.

Каштоўны вопыт стварэньня груп спачуваючых паказаў палітаддзел Ільлінскай МТС Заходняй Сібіры. («Правда» № 211, 2 жніўня г. г.). Палітаддзельцы праз ячэйку скапілі лепшых актывістаў калгасу на бяседу, растлумачылі ім аб значэньні і рабоце груп спачуваючых і паралі жадаючым падаць заяву ў ячэйку. Ячэйка разьбірала гэтыя заявы на бюро, пасьля зацьверджаньня райкомам група лічылася аформленай. Да кожнай групы прымацоўваецца парт орг, раз у дэкаду праводзяцца палітзаняткі па выпрацаванай палітаддзелам праграме. Спачуваючым ячэйка дае асобныя даручэньні. Вопыт палітаддзелу Ільлінскай МТС трэба скарыстаць у рабоце калгасных ячэек.

Вялізарнейшую ролю ў справе ўзьняцьця тэмпаў і якасьці работы па ўборцы, арганізацыі абмалоту і збожжапаставак павінна адыграць чыстка партыйных радоў.

Кожная партарганізацыя, кожны вясковы камуніст павінен памятаць, што яго здольнасьць змагацца за генэральную лінію партыі, яго годнасьць як бальшавіка праявяецца іменна на рабоце па ўборцы, на абмалоце, на збожжапастаўках. Тут трымае баявы экзамэн кожны вясковы камуніст. Аб гэтым нельга забываць.

Партыя не пацерпіць у сваіх радох такіх камуністаў, хто сваімі апартуністычнымі гніла-лібэральнымі адносінамі да даручэньняў яму партыяй работы будзе зрываць адказнейшыя мерапрыемствы, праводзімыя на вёсцы. Усім сваім вострым чыстка будзе накіравана супроць тых, хто прабуе пад прыкрыцьцём партбілету сабатаваць важнейшыя мерапрыемствы партыі, накіраваныя на ўздым сельскай гаспадаркі.

Хуткай перабудовай партыйнай работы ня толькі па форме, але і па сутнасьці, бязьлітаснай барацьбой супроць усялякі спроб кулацкіх элементаў і іх агентаў унутры партыі расьцягваць уборку, сарваць пастаўку збожжа дзяржаве дабёмся баявога завяршэньня ўборкі.

УСЕСАЮЗНАЯ ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

«Сацыялістычнае спаборніцтва гаворыць: адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція лепш,—даганяй лепшых і дабіся агульнага ўздыму».

(СТАЛІН).

ПА ПРАДСТАЎЛЕНЬНІ ДНЕПРАПЯТРОЎСКАГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТУ КП(б)У І АБЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ, ЗАНОСІЦЦА НА ВСЕСАЮЗНУЮ ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ:

1. КАЛГАС «ВОСХОД», НОВАТРОІЦКАГА РАЁНУ, ДНЕПРАПЯТРОЎСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ.

КАЛГАС ДАБІЎСЯ ЗНАЧНЫХ ПОСЬПЕХАЎ У ПАВЫШЭНЬНІ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ, У ПРЫВАТНАСЬЦІ ЯРАВЫХ КУЛЬТУР. ПШАНІЦЫ САВРАНА Ў СЯРЭДНІМ 10 ЦЭНТНЭРАЎ З ГЭКТАРА, ЯЧМЕНЮ—19 ЦЭНТНЭРАЎ.

ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАН ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАПАСТАВАК ДЗЯРЖАВЕ, УНЕСЕНА НАТУРАПЛАТА МТС І СТВОРАНЫ НАСЕННЫ, СТРАХАВЫ І ФУРАЖНЫ ФОНДЫ.

КАЛІ Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ НА ПРАЦАДЗЕНЬ У КАЛГАСЕ ПРЫПАЛА МЕНШ 2 КІЛЁГРАМ, ДЫК У ГЭТЫМ ГОДЗЕ КАЛГАСЬНІКІ АТРЫМЛІВАЮЦЬ НА КАЛГАСНЫ ПРАЦАДЗЕНЬ АДНЫХ ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР ЗВЫШ 6 КІЛЁГРАМ, А РАЗАМ З АСТАТНІМІ КУЛЬТУРАМІ—КАЛЯ 8 КІЛЁГРАМ.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ ТАВ. КУШНІР ІВАН. ЛЕПШЫ БРЫГАДЗІР-ЎДАРНІК ТАВ. ШАЎЧЭНКА ЯФРЭМ; ЛЕПШЫЯ КАЛГАСЬНІКІ-ЎДАРНІКІ ТАВАРЫШЫ: МАРОЗ ДАВІД, ЕСЕН НАЗАР, ЖУКАВА ФЕНЯ, ДЗІЦЯТКА СОФ'Я, ШАЎЧЭНКА ІВАН.

Скончылі жніво азімых

МЕНСК, 8 жніўня. Калгасы Менскага раёну, якія абслугоўваюцца МТС, пад апэрацыйным кіраўніцтвам палітаддзелаў поўнасьцю скончылі жніво азімых і пераключыліся на уборку збожжавых яравых, на малацьбу і здачу збожжа дзяржаве.

ЛІХ.

З ФРОНТУ УБОРАЧНАЙ

БАБРУЙСК

ЯКАСЬЦЬ уборкі па-ранейшаму самы ЗАБЫТЫ ВУЧАСТАК. Барацьба са стратамі не арганізавана.

У калгасе «Новае жыцьцё» ўсе жыта ляжыць працуюць без зерняўлавіцеляў. На зжатых палёх застаецца шмат каласоў. Іх ніхто не падбірае. Яны асыпаюцца і збожжа гіне.

Аналёгічнае становішча і ў калгасе «Сьвет». Тут на кожны квадратовы мэтр зжатага поля траціцца ў сярэднім па 12-13 грам збожжа, якое застаецца ў нязбраных каласох.

У цэлым гэта ПАГРАЖАЕ СТРАТАЙ ЗВЫШ 18 ТОН ЗБОЖЖА, ад чаго, калі ня будуць ужыты самыя тэрміновыя меры, кожны ПРАЦАДЗЕНЬ ЗЬМЕНШЫЦЦА НА 600-700 ГР.

Аднак, і пасьля гэтых падлікаў, зробленых селькорамі калгасу, праўленьне ня ўжывае ніякіх захадаў. Падграбаньне каласоў па-ранейшаму не праводзіцца. І гэта небясьпечнейшая зьява набыла ў раёне самыя сур'ёзныя разьмеры.

Далейшая маруднасьць—простае злачынства!

П. ЧЫКУН.

БЯГОМЛЬ

АБМАЛОЧАНАЕ ЗБОЖЖА АСЯДАЕ ў сьвірнах. У раёне злачынна ігнаруецца канвэерная здача збожжа—проста з-пад малатарні на прыёмачны пункт.

Праілюструем фактамі.

У калгасах «Бальшавік» і «Чырвоны ўдарнік» збожжа з першага абмалоту ўжо больш пяці дзён ляжыць у сьвірнах. Праўленьні калгасаў сьвядома затрымліваюць збожжа, маркуючы раздаць першы абмалот на авансы.

Асяданьне збожжа—яркае праяўленьне кулацка-спажывецкіх настрояў. Яно вядзе да разбазараньня першага абмалоту.

Старшыня калгасу імя Будзённага Пашкевіч увесь першы абмалот у колькасьці адной тонны цалкам раздаў на авансы.

Па такой-жа кулацкай сьцежцы пайшоў і калгас «Перамога». Увесь першы абмалот разьмяркова на авансы, а дзяржаве калгас ня здаў ні аднаго кілё.

Спажывецка-месьніцкія настроі не сустракаюць у раёне патрэбнага адпору.

П. В.

РЭЧЫЦА

Аб ТРОХ сур'ёзьнейшых ПАМЫЛКАХ сыгналізуюць першыя вынікі ўборачных работ і абмалоту.

ПЕРШАЯ — існуе недапушчальны разрыў паміж уборкай і абмалотам. Высушанае збожжа ня ідзе на малатарню, а асядае ў гумнах.

Калгасы «Чырвонае жыцьцё», імя Сталіна і «Чырвоны барацьбіт», пад рыхтаваўшы збожжа для абмалоту, трымаюць яго ў сьвірнах, а малатар ні стаяць. Абмалот пачаўся толькі ў апошнія дні.

ДРУГАЯ—труба парушаецца дырэктыва ЦК і СНК аб тым, каб збожжа паступала на прыёмачныя пункты проста з-пад малатарні.

Калгасы «Ударнік» і імя Леніна, абмалаціўшы збожжа з першых убраных гэктараў, трымаюць яго ў сьвірнах.

Калгасы «Чырвонае жыцьцё», імя Сталіна і «Чырвоны барацьбіт», нарэшце, прыступіўшы да малацьбы, таксама трымаюць у сябе абмалочанае збожжа. Адным словам, збожжа асядае ў калгасах, а ня ідзе з-пад малатарні на прыёмачныя пункты.

Рэзка адчуваецца шкоднае захапленьне ўсераённымі абозамі, калі калгасы затрымліваюць збожжа, каб здаць яго ўсім разам.

ТРЭЦЯЯ—поўнае ігнараваньне малатарні. У цэлым радзе калгасаў абмалот зрываецца, а малатарні стаяць.

Характэрнай ілюстрацыяй зьяўляецца калгас імя Дзяржынскага. Тут стаяць дзве трактарныя малатарні і два трактары. Няма падшыпнікаў, пасаў і г. д. МТС, якая дасылала гэтыя малатарні і трактары, ня прымае ніякіх мер.

Райком абавязан ужыць рашучыя захады, каб свячасова правесьці аб малот і пастаўкі, не дапускаючы ні адной гадзіны прастою малатарань.

Д.

СЯННО

Каб папярэдзіць страты збожжа ад перастою на корані, у раёне ўпяршыню шырока практыкуецца касьба жыта і ячменю косамі.

Для роўнага і акуратнага зьбірань ня скошанага жыта да кос прыладжаны грабелькі.

Прадукцыйнасьць працы на касьбе высокая. 5-га жніўня 12 касцоў у Старабеліцкім калгасе ўбралі 8 гэктараў жыта, тады як 50 жанчын зжалі толькі 8 га.

Адзін касец убірае плошчу за чатырох жанчын. На гэту работу пастаўлены лепшыя, праверапыя касцы. Райком і палітаддзел раілі калгасам шырока ўжываць касьбу жыта і ячменю з тым, каб вызваліць жанчын для цераблення ільну.

А з уборкай ільну справа ў раёне стаіць зусім нездавальняюча. У раёне засеяна 8.400 гэктараў ільну. На 1 жніўня ўжо вырвана 172 га. Аднак, у цэлым падрыхтоўка да ўборкі і апрацоўкі ільну праведзена дрэнна. І па сёньняшні дзень ільнацерабілкі не адрамантаваны і не накіраваны ў калгасы. 130 мялак таксама яшчэ не адрамантаваны.

Райком і палітаддзел павінны прыняць рашучыя захады да неадкладнага скончаньня рамонту, каб забясьпечыць свячасовую ўборку і апрацоўку ільну.

Ар.

МСЬЦІСЛАЎЕ

ЗВЫШ ЦЭНТНЭРА збожжа на кожны зжаты гэктар траціць калгас «НОВЫ БЫТ».

Пасьля жніва застаецца шмат нязжатых каласоў, якія не падбіраюцца. Адсюль і вялікія страты.

Чаму ў калгасе такое становішча? Чаму калгас не змагаецца са стратамі?

Справа ў тэй сыстэме аплаты, якую ўстанавіла праўленьне калгасу за жніво. Гэта сыстэма ўлічвае толькі колькасьць, а якасьць адкідваецца на задні плян.

ЗА КОЖНЫ ЗЖАТЫ ГЭКТАР ДАЕЦЦА ПА 48 КГР. ЗБОЖЖА. Такая-ж кулацкая сыстэма ўстаноўлена і ў цэлым радзе іншых калгасаў раёну, напрыклад, у калгасе Казіміра і г. д. І тут за кожны ўбраны гэктар налічваюць па 48 кгр. збожжа.

Раённыя арганізацыі ня выкрылі гэтага новага манэўру кулака, не зрозумелі, што такая аплата вядзе да простата падрыву калгасаў, да масавага разбазараньня калгасных ураджаяў.

Дапушчаныя грубейшыя скажэньні павінны быць неадкладна і рашуча выпраўлены, а канкрэтныя вінаватыя ў гэтых кулацкіх махінацыях павінны панесьці самую суровую адказнасьць.

К.

Пуцёўка да пракурора

На гаспадарчай вышыні

Старшыня калгасу «Усход» (Бабруйшчына) ШАЎЧУК злачынна разбазарвае збожжа новага ўраджаю. Ня здаўшы дзяржаве ні аднаго кілё, ён дапусьціў кулацкую ўраўнілаўку і раздаў увесь першы абмалот на авансы бяз усякага ўліку працадзён.

Мал. Вал. Мядзьведзева.

ЗВОДКА

аб ходзе ўборкі азімых і яравых па раёнах БССР на 5 жніўня 1933 г. (у гэктарах)

Назва раёнаў	Усяго жата: Плян	Жата	Проц.	Калгасы жата % у проц. да пляну	Калгасы жата % у проц. да пляну	Адзяжобліні жата % у проц. да пляну	Усяго вывезена: Вывезена	Проц. да жатага
1. Камарынскі	5883	5724	96,1	—	—	78,1	3029	52,9
2. Брагінскі	12016	9146	76,1	67,0	92,9	58,8	2503	27,4
3. Менскі	18812	13354	71,0	30,7	89,1	47,0	85	0,3
4. Лоеўскі	10467	7430	71,0	80,4	74,6	67,3	4267	57,4
5. Мазырскі	25459	17119	67	37,6	74,1	64,0	—	—
6. Крычаўскі	9420	6056	64,3	—	81,3	35,5	—	—
7. Петрыкаўскі	15663	10036	64,1	26,6	65,1	66,0	7808	77,8
8. Парыцкі	19013	12123	63,7	6,6	66,1	63,4	7805	64,4
9. Хойніцкі	12246	7649	62,5	64,2	84,3	48,4	5128	67,0
10. Полацкі	19564	12177	62,2	0,3	90,4	81,3	530	4,4
11. Чыр.-слабодзкі	10684	6484	60,8	12,3	76,3	54,1	—	—
12. Жлобінскі	20032	11614	58,5	—	72,2	56,2	5777	48,9
13. Глускі	18042	10282	57,0	8,0	74,8	50,3	1303	12,1
14. Старобінскі	18067	7358	56,3	4,4	72,9	46,2	—	—
15. Дрысенскі	11888	6624	55,7	—	61,6	49,5	—	—
16. Барысаўскі	19555	10835	55,4	10,3	61,8	65,2	6248	57,7
17. Церахаўскі	21660	11679	53,8	7,2	66,1	48,9	7401	63,4
18. Лельчыцкі	9500	5089	53,5	76,6	63,5	—	2127	41,8
19. Вузьдзенскі	11004	5952	53,1	—	66,9	41,1	283	4,8
20. Ельскі	10226	5142	50,3	97,1	57,3	37,0	2049	39,1
21. Слуцкі	22369	11312	49,5	—	60,4	39,0	1027	9,1
22. Пухавіцкі	26473	13093	49,5	18,5	43,6	53,6	931	7,1
23. Тураўскі	4834	2405	49,4	60,0	53,6	44,1	893	37,2
24. Рэчыцкі	20601	10155	48,5	35,5	51,4	48,7	5490	52,1
25. Вушацкі	15587	7277	46,8	—	68,5	24,4	4033	55,4
26. Веткаўскі	22736	11288	46,3	26,6	47,2	51,9	5501	48,7
27. Буда-Кашалеўскі	11186	5164	46,1	—	61,1	40,2	277	5,3
28. Уваравіцкі	15145	7086	45,3	—	74,1	39,0	4282	60,4
29. Гомельскі	8458	3826	45,2	39,1	42,4	44,0	2432	63,6
30. Касьцюковіцкі	26761	11670	43,6	—	51,4	25,0	2195	18,5
31. Копыльскі	21139	8987	42,5	42,0	48,4	37,8	715	8,0
32. Кармянскі	16002	6719	41,6	—	52,5	36,3	2662	39,6
33. Расонскі	11836	4895	41,4	—	50,7	37,0	147	3,0
34. Любаньскі	10420	4351	41,0	58,1	51,6	36,0	3087	70,9
35. Рагачоўскі	28347	11370	40,1	48,8	45,2	38,5	—	—
36. Жыткавіцкі	5950	2351	39,4	—	36,3	36,4	200	8,5
37. Бярэзінскі	17980	7075	39,3	14,9	41,3	39,0	5594	79,1
38. Вабруйскі	27402	10844	38,4	—	54,2	35,4	736	6,8
39. Чэрыкаўскі	14418	5147	35,7	—	47,1	16,3	1060	20,6
40. Смаляніцкі	16763	5839	35,0	2,6	45,3	32,4	257	4,4
41. Асіпаліцкі	10906	3761	34,5	—	49,4	25,4	819	21,6
42. Крычаўскі	15332	4981	32,5	—	32,8	36,3	1929	48,5
43. Чавускі	25858	8249	32,4	—	43,2	26,5	1756	21,3
44. Дубровенскі	13917	4449	32,0	—	40,1	25,5	—	—
45. Быхаўскі	24328	7777	31,9	11,1	40,4	29,2	3742	46,1
46. Нараўлянскі	10643	3351	31,5	—	35,2	30,6	2426	72,4
47. Старадароскі	12990	3790	29,2	—	41,5	26,0	1199	31,6
48. Бялынецкі	17475	5068	29,1	—	26,3	30,3	1553	30,6
49. Віцебскі	11326	3369	29,7	33,9	34,3	17,0	166	4,9
50. Плешчаніцкі	12428	3310	26,6	—	28,6	26,6	103	3,1
51. Сеньненскі	17905	1680	26,1	—	—	—	64	7,4
52. Магілеўскі	24496	6172	25,2	8,5	33,0	21,5	1356	21,9
53. Прапойскі	14914	3702	24,8	—	36,2	15,6	953	25,9
54. Дзяржынскі	15431	3806	24,7	10,4	30,4	8,5	—	—
55. Бягомльскі	11594	2865	24,7	—	30,6	16,3	180	6,3
56. Чачэрскі	14665	3340	22,8	19,2	31,1	19,7	2472	74,0
57. Мсьціслаўскі	22702	5218	22,5	6,1	26,0	10,3	870	15,4
58. Аршанскі	26934	5674	21,1	6,6	27,5	11,3	519	9,1
59. Чашніцкі	13765	2822	20,5	33,8	34,7	8,4	228	8,1
60. Крупскі	18532	3592	19,4	—	20,2	16,5	784	21,5
61. Лепельскі	17097	3270	19,1	—	19,4	18,4	659	20,2
62. Заслаўскі	11701	2219	19,0	1,9	25,7	8,0	—	—
63. Бешанковіцкі	13935	2486	17,7	35,4	18,8	17,2	211	8,5
64. Горацкі	23732	3828	16,1	6,2	21,3	11,0	693	18,1
65. Чырвонапольскі	15303	2365	15,5	—	21,0	10,9	699	29,6
66. Суражскі	10428	1581	15,2	27,2	14,8	15,2	178	11,3
67. Сіроцінскі	12980	1904	14,7	—	20,7	10,5	—	—
68. Лагойскі	14351	2049	14,3	—	16,0	12,3	—	—
69. Асьвейскі	5617	802	14,3	—	16,2	13,3	14	1,7
70. Гарадоцкі	24245	3430	14,1	—	19,9	10,2	494	14,4
71. Лёзьненскі	15026	2035	13,7	—	8,7	14,8	—	—
72. Шклоўскі	23589	2851	12,1	26,4	14,2	10,1	—	—
73. Талачынскі	22476	2462	10,8	—	17,4	6,3	327	13,3
74. Чэрвеньскі	16134	1630	10,1	2,8	15,3	8,4	731	89,5
75. Клімавіцкі	20476	915	4,5	—	4,9	2,5	439	48,0
Па БССР	1223744	456999	37,3	14,7	42,5	33,6	135714	29,7
Было на 1/VIII	»	91235	7,5	2,7	8,1	6,8	31515	34,5

ГОМЕЛЬ

16 КГР. КАЛАСОЎ ТОЛЬКІ ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ САБРАЛІ ДЗЕЦІ КАЛГАСЬНІ КАЎ С.-Г. АРЦЕЛІ «КАМСАМОЛ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ» СА ЗЖАТАГА ПОЛЯ.

КАЛГАС НА СПРАВЕ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ЯКАСЬЦЬ УБОРКІ, СУПРОЦЬ СТРАТ. ПАДГРАБАНЬНЕ КАЛАСОЎ ЦЯПЕР ПРАВОДЗІЦЦА АДРАЗУ ПАСЬЛЯ ЎБОРКІ, СЬЛЕДАМ ЗА ЖАНЦОМ І КАСЦОМ.

ПРЫКЛАД САПРАЎДНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПАКАЗВАЕ І КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА.

УБОРКА ЖЫТА І ЯЧМЕНЮ, А ТАК САМА РАНЬНЯЙ ГРЭЧКІ СКОНЧАНА. УСЁ ЗБОЖЖА БЫЛО ЗЬВЯЗАНА Ў СНАПЫ І НЕАДКЛАДНА ПАСЬЛЯ ПРАСУШВАНЬНЯ ПАДВЕЗЕНА ДА МАЛАТАРАНЬ.

КАЛГАС АРГАНІЗАВАЎ ПІЛЬНУЮ АХОВУ НОВАГА ЎРАДЖАЮ. КОЖНЫ БРЫГАДЗІР ПАСЬЛЯ ЖНІВА ДА КЛАДНА ПАДЛІЧВАЕ КОЛЬКАСЬЦЬ СНАПОЎ І ЗДАЕ ІХ ПАЛЯВЫМ ВАРТАЎНІКОМ. А РАНІЦОЙ ПРЫМАЕ ТОЛЬКІ ПАСЬЛЯ ПАЎТОРНАГА КАНТРОЛЬНАГА ПАДЛІКУ.

НАЛАДЖАН ТАКСАМА ДОБРЫ КАНТРОЛЬ ЗА ЯКАСЬЦЮ МАЛАЦЬБЫ. НА ПАДАЧЫ СНАПОЎ У БАРАБАН ПРАЦУЕ САМ СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ ТАВ. М. ЧЫКУНОЎ.

КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА ПОЎНАСЬЦЮ ЗДАЎ ДЗЯРЖАВЕ ЖЫТА І ЯЧМЕНЬ ПА ЦЬВЁРДЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАХ.

Я. ІВ.

КРУПКІ

ПРАСТОІ жнівараж на палёх калгасаў раёну—звычайная зьява. Рамонт жнівараж праведзен зусім нездавальняюча, а адсюль і частыя паломкі, прастоі.

Для прыкладу назавем калгас «ГІГАНТ», Халопеніцкага сельсавету, дзе жнівяркі ня столькі працуюць на полі, колькі стаяць.

Жнівяркі ў гэтым калгасе не правераны, адрэмантаваны дрэнна і адсюль—бясконцыя прастоі. Мала таго. Жнівяркі даверены ня вопытным машыністам, а людзям, якія амаль зусім ня ведаюць, як трэба працаваць з машынай.

Ня дзіва, што пасьля жніва застаюцца цэлыя высны нязжатых каласоў. Падграбаньне не арганізавана.

Тое самае і ў калгасе «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», на палёх якога мож на знайсьці колькі хочаце нязжатых, патаптаных каласоў.

Праўленьне калгасу дае адзін і той-жа стандартны адказ:

— Вінаваты... машыны. Яны дрэн на жнуць.

Раённыя арганізацыі не змагаюцца з антымэханізатарскімі тэндэнцыямі. Жнівяркі выкарыстоўваюцца проста злачынна. Аб барацьбе са стратамі ніхто пават і ня думае.

Няўжо-ж крупскія кіраўнікі не разумеюць, што гэта пагражае зрывам свячасовай у

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

УТРЫМАЦЬ ЗАВАЯВАНАЕ ПЯРШЫНСТВА, ВЫВЕСЬЦІ РАЕН У РАДЫ ПЕРАДАВЫХ па ўборцы і пастаўцы збожжа дзяржаве—абавязак бальшавікоў слуцкай партарганізацыі

На ўзровень задач

СЛУЦАК. (Ад нашага спец. кар.). Калгас імя Сталіна. Ад самага раю вёскі далёка аж да чорнай кромкі лесу, цягнуцца калгасныя палі.

—Гэта ўсё наша—гаворыць калгасьнік т. Гурзвіч. Гэта таксама наша—э гонарам дадае ён, паказваючы на новыя белыя будынкі—толь і што пабудаваную стайню, сьвінарнік.

—Вы пытаеце, як мы жывем? Вельмі дружна, спрытна сёлета ідзе ў нас работа. Нас у калгасе 5 яўрейскіх сем'яў з мястэчка, з іншымі калгасьнікамі ўзаемаадносіны добрыя. Наш калгас інтэрнацыянальны.

На ўборку выйшлі ўсе да аднаго калгасьніка, усе змагаюцца за якасьць уборкі, за хуткія тэмпы.

І сапраўды. На перагонку ідуць палёх 4 калгасныя жнівяркі. Ля іх пастаўлены найбольш вопытныя калгасьніцы. На абагуленых палосках наступіўшых летам калгасьніяў жнуць серпом.

Калгас пачаў уборку 31 ліпеня. У гэты дзень быў пробны выезд. Перага жніўня разгарнулася масавая уборка, хоць некалькі і перашкодзіў дождж. Затое 2 жніўня работа ішла поўным ходам. Добра падрыхтаваныя гадзя жнівяркі працавалі без перапыну. Правільна былі расстаўлены сілы ў брыгадах. Кожная брыгада і вяно-мелі пляны работы на кожны дзень уборкі.

Тут-жа на полі ў абедзены перапынак першая брыгада робіць вытворчую нараду. Яе скарыстоўвае сакратар ячэйкі т. Андрзеў. Ён коратка сказвае аб міжнародным чырвоным і першага жніўня. Гэта пытаньне дае адарваць ад задач, якія зараз непасрэдна стаяць перад калгасьнікамі.—Трэба ўмацоўваць абарону краіны якасным правядзеньнем уборкі—гаворыць калгасьнік. Брыгада рапортуе 5 дзён скончыць уборку жыта і пераменю і адразу пачаць абмалот, каб першага ўраджаю здаць збожжа дзяржаве.

Ударніца першай брыгады тав. Масеўская выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва т. Жаўрын. Тая ў сваю чаргу заключыла дагавор з Карповіч Хвядосьсяй на лепшую вязку снопаў, добраякасную уборку. Іх прыклад пасьледавалі і іншыя калгасьнікі. Дагавор на заўтра зьмешчан у насценнай газеце.

Да вечару падрылі вынікі. Абедзьве брыгады выканалі нормы, даўшы больш чым па 10 га жатага жыта. Перадавыя калгасьніцы значна перакналі норму: Мазалеўская і Масьленікава зьвязалі па 5 коп, Койка Ганна чатыры з паловай. Не адстаюць іх Хрушчова, Васілевіч Каця, Ковіч Яканў і інш.

Але змагаюцца ня толькі за тэмпы. Пра ўборыць, каб ні аднаго коласу не асталося на полі—аб этым клапоцца ўсе. А зжаць трэба шмат: жыта і ячменю 93 га. На дапамогу прыйшла ініцыятыва калгаснага актыву. Ціхчоў Міхась надумаў сам змайстраваць конныя граблі. Доўга меркавалі, нешта маляваў на паперы, зьбіў па кавалку жалеза, старыя калёсы—потым у кузьні выйшлі добрыя конныя граблі. Яны праверены зараз самай рабоце і зьберагаюць шмат рабочых рук калгасу: за дзень зьбіраюць каласоў з 8 га.

У калгасе ёсьць добры беспартыйны актыў. Узяць, напрыклад, Мінчэнко, брыгадзіра першай брыгады. Ён добры калгасьнік, добра ведае калгасную гаспадарку. Работа ў яго брыгадзе дакладна па плану, наладжана работы. На прыкладах яго работы вучыцца брыгадзір другой брыгады Якубовіч Васіль. Яго брыгада маладая, большасьць калгасьнікаў у ёй нядаўна ўступіўшыя ў калгас.

—Калі работаць ударна, дык мы спецы, а вось з улікам работы цяжкавата спачатку—гаворыць т. Якубовіч. Але і другая брыгада не ядзе тэмпаў.

Ёсьць у калгасе рад актывістак калгасьніц, як т. Мазалеўская і інш.

Пастаянная работа з беспартыйным актывам партыйная ячэйка яшчэ не наладзіла. Некаторых актывістаў ячэйка ўцягнула ў спачуваючыя. Аднак, работы з імі яшчэ не пачала. А гэта неабходна. Ці нельга хоць раз у дэкаду зьбіраць гэтых актывістаў і праводзіць з імі гутаркі, уцягваць спачуваючых у практычную работу, даючы ім асобныя даручэньні ад ячэйкі, дапамагаючы іх выконваць.

Ячэйка пры калгасе імя Сталіна існавала і да пастановы ЦК УсеКП(б) аб калгасных ячэйках, але па сутнасьці яна займалася тымі-ж пытаньнямі, што і сельсавецкая ячэйка. Нават у абедзьвюх ячэйках быў адзін сакратар т. Коршук. Зараз райком даў у ячэйку калгасу асобнага сакратара т. Андрзева. Аднак, ён непасрэдна не занят працай у калгасе, ён працуе прапагандыстам райкому і гэта, зразумела, адбіваецца на рабоце ячэйкі. Напрыклад, у самы разгар уборкі т. Андрзеў паехаў у другі сельсавет для інструктаванньня грушавых агітатараў, у той час як у калгасе імя Сталіна работа брыгадных агітатараў не наладжана.

У ячэйцы 6 членаў і кандыдатаў партыі. Апрача старшыні калгасу і сакратара ячэйкі, два камуністы т. т. Каравай і Масьленікаў працуюць машынаважатымі, т. Шэвц—кладаўшчыком і кандыдат т. Жук—у палявой брыгадзе.

У першай брыгадзе парторгам працуе т. Масьленікаў. Ён дае добры прыклад на вытворчасьці, старанна навучае працуючага на другой жнівярцы калгасьніка сваёй брыгады, але партыйна-масавай работы ў брыгадзе ў часе ўборкі не разгарнуў. «Зараз няма часу праводзіць гутаркі»—заяўляе Масьленькайў.

У гэтым вінават ня толькі Масьленікаў, сакратар ячэйкі штодзенна павінен інструктаваць парторгаў, даваць ім канкрэтныя ўказаньні на кожны дзень. А гэтага пакуль што няма.

Для ўмацаваньня 2-й брыгады вылучан парторгам т. Шэвц. Ён пачынае ўжо работу ў брыгадзе: правёў гутарку з калгасьнікамі аб збожжапастаўках і авансаваньні калгасьнікаў, правёў чыткі газэт аб пастановах пленуму ЦК КП(б)Б па ўборачнай кампаніі. Гэту работу трэба замацаваць.

5-га жніўня калгас у асноўным скончыў уборку жыта і ячменю. Посьпеху жніва значна садзейнічаў моцны паварот ячэйкі да пытаньняў калгаснай вытворчасьці; ячэйка перад уборкай заслухала даклад старшыні калгасу аб падрыхтоўцы да ўборачнай, даклады партсягаў аб падрыхтоўцы ў брыгадах.

Аднак, гэтага мала. Перад ячэйкай стаіць шмат неадкладных пытаньняў. Трэба правільна арганізаваць абмалот і збожжапастаўкі, а малатарні калгасу даюць перабоі. Трэба арганізаваць ахову калгаснага ўраджаю, замацаваць сацспаборніцтва, якое разгарнулася ў першай брыгадзе і перанесьці яго ў другую брыгаду.

Усе гэтыя задачы ячэйка выканае пры правільна разгорнутай масавай рабоце. Гэту работу трэба перанесьці ў брыгаду, у зьвяно, на поле.

Слуцкі раён.

Г. Р-ва

Згуртаваць беспартыйны актыў вакол калгасных ячэек

(Гутарка з начальнікам палітаддзелу Слуцкай МТС тав. Бангайцісам)

Слуцкая МТС абслугоўвае 55 калгасаў. На аснове пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15-VI райком і палітаддзел МТС правялі рэарганізацыю партыйных ячэек у раёне дзейнасьці МТС. З тэрытарыяльных ячэек выдзелены члены і кандыдаты партыі, якія працуюць у калгасах «Новае жыцьцё» і «Памяць Ільліча». У гэтых калгасах створаны кандыдацкія групы. У калгасе «1-га мая» існуе парт'ячэйка, якая пасьля выдзяленьня прымацаваных з гораду камуністаў ператворыцца ў кандыдацкую групу. У 23 калгасах створаны партыйна-камсамольскія ядры. Камуністамі гэтых калгасаў непасрэдна кіруе палітаддзел. Такім чынам у калгасах МТС усяго ёсьць 37 чал. членаў і кандыдатаў партыі, большасьць з іх працуе старшынямі калгасаў і толькі 3 камуніста непасрэдна ў брыгадах. Брыгадзіраў-камуністаў зусім няма — тут прыходзіцца апірацца на беспартыйны калгасны актыў.

Для партыйнай работы ў калгасах МТС, дзе няма камуністаў або слабая партпраслойка, райком вылучыў 20 партыйцаў у якасьці партарганізатараў, з іх 10 з тэрытарыяльных сельсавецкіх ячэек, і астатнія з гораду. Апрача таго, у 33 калгасах ёсьць камсамольскія ячэйкі, якія ахопліваюць 234 членаў КСМ.

Так у асноўным арганізацыйна праведзена рэарганізацыя сеткі партыйных ячэек.

У радзе калгасаў палітаддзел правёў работу па арганізацыі груп спачуваючых. Па 15 калгасах ёсьць каля 100 калгасьнікаў-актывістаў, з якімі вядзецца работа.

У некаторых калгасах — «Праўда», «Вольная праца», «Перамога» і інш. ёсьць да 10 спачуваючых з беспартыйнага калгаснага актыву. Аднак, групы спачуваючых арганізацыйна яшчэ не афармлены.

Зараз стаіць задача перабудаваць мэтады партыйнай работы ў калгасах, перанесьці цэнтр яе цяжару ў брыгады. Гэта — асноўная ўстаноўка, якую даў палітаддзел партыйцам калгасаў. Мэтады кіраўніцтва палітаддзелу гэта — жывая сувязь з калгасамі, выезды па месцы, у рэдкіх выпадках асабістыя лісты.

Гэта перабудова партыйнай работы адчуваецца зараз у рабоце раду калгасаў. У такіх калгасах як «Новы мір», «Новае жыцьцё», «Праўда», «Случ» камуністы больш канкрэтна кіруюць калгаснай вытворчасьцю, ушчыльную падыходзяць да справы барацьбы за якасьць уборкі, барацьбы са стратамі. У гэтых калгасах уборка ідзе лепш іншых калгасаў. Напрыклад, калгас «Новае жыцьцё» 2-VIII скончыў уборку жыта, таксама скончана жніво ў калгасе «Вольная праца», калгас «Будзённы» разам з уборкай пачаў абмалот і здачу збожжа дзяржаве.

З другога боку, у радзе калгасаў камуністы невыстарчальна зьвязаны з калгаснай вытворчасьцю, зусім дрэнна працуюць некаторыя партпрымацаваныя. Так, тав. Мікульскі ў калгасе «Ботвін» толькі тупае каля праўленьня замест таго, каб перанесьці сваю работу ў брыгаду.

Як пастаўлена партыйна-масавая работа? Мы практыкуем 1 раз у дэкаду партыйныя сходы ў калгасах, на якіх абгаварваюцца асноўныя пастановы партыі і ўраду і надзвычайныя пытаньні работы ў калгасах (уборка, здача збожжа, асеньняя сяўба). Гэтыя пытаньні потым пераносяцца ў масу калгасьнікаў. Палітаддзел дапамагае партыйцам указаньнямі, дзе і якія пытаньні ставіць.

У калгасах «Праўда», «Случ № 2», «Новае жыцьцё» праводзіцца палітгадзіна ў брыгадах — гутарка, чытка газэт. Гэта работа разгортваецца проста на полі ў часе абеду. Практыкуюцца вытворчыя нарады ў брыгадах, выпускаюцца штодзённікі.

Аднак, гэта работа далёка не ва ўсіх калгасах увайшла ў сыстэму работы камуністаў. Напрыклад, у калгасах «Чырвоны шлях», «Ботвін», «Колас» ня бывае брыгадных вытворчых нарад. Ва ўсёй сваёй рабоце палітаддзел апіраецца на калгасны актыў, які аказвае значную дапамогу палітаддзелу. Напрыклад, у калгасе «Бальшавік» мы заўважылі кулацкую агітацыю, накіраваную на зрыў абагуленьня пасеву азімых. Беспартыйны актыў значна дапамог у растлумачэньні калгасьнікам гэтага пытаньня. У выніку абагуленьне ў калгасе было поўнасьцю праведзена.

Значная частка камуністаў на вёсцы яшчэ не навучылася працаваць з беспартыйным актывам. Разгортваньне работы з беспартыйным актывам, выхаваньне яго на практычнай рабоце — важнейшае зьвяно ў далейшай рабоце калгасных ячэек.

Калгасы МТС скончылі сенакашэньне і выканалі план сепазагатовак (за выключэньнем калгасу «Ботвін»).

Зараз праходзіць масавая ўборка азімых, абмалот і здача збожжа дзяржаве.

Перад пачаткам уборкі палітаддзел правёў нарады заг. вучасткаў, брыгадзіраў, старшынь калгасаў. Зараз праводзім зьлёты па вучастках па пытаньні ўборкі, асеньняй сяўбы, паставак збожжа дзяржаве. Для практычнай дапамогі выяжджаем у калгасы. Для прыёму збожжа ўсё падрыхтавана, расстаўлены вожаўшчыкі, падрыхтаваны склады, адрамантаваны малатарні. Для правядзеньня масавай палітработы ў часе абмалоту вылучана 18 палітрукаў.

ЦЭНТР—У БРЫГАДЗЕ

Калгас «Гігант» невыстарчальна падрыхтаваўся да ўборкі. Ячэйка не расставіла партыйцаў і камсамольцаў на рашаючых вучастках, не прапрацавала сярод калгасьнікаў пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў, не наладзіла выпуску брыгадных штодзенак. Гэта адзначыла бюро Слуцкага райкому, калі заслухала даклад сакратара ячэйкі т. Шостака.

Як справілася ячэйка з выкананьнем дырэктыў, якія даў РК у час уборкі?

Пастанову райкому ячэйка абгаварыла на партыйным сходзе. Вызначылі людзей для прапрацоўкі пастаноў райкому ў брыгадах. Склікалі нараду партарганізатараў і брыгадных агітатараў — членаў партыі і членаў КСМ.

— У пастанове бюро РК запісана, што мы павінны праводзіць кожную раніцу перад пачаткам работы 5-хвілінную палітзарадку і чытку газэт у абедзены перапынак. Мы павінны гэта выканаць. Заўтра-ж трэба пастанову райкому растлумачыць у брыгадах, — заявіў на нарадзе сакратар ячэйкі тав. Шостак.

Расставілі сілы, пачалі растлумачальную работу ў брыгадах. На камсамольцаў (у калгасе камсамольская ячэйка з 9 членаў) усклалі адказнасьць за выпуск штодзенак.

Так мабілізаваліся па ўборку ў першую чаргу азімых на плошчы ў 163,5 га і яравых—513 га, на выкананьне абавязкаў перад дзяржавай у 411 цэнтн. збожжа.

Выйшлі на поле, не чакаючы агульнага пасьпяваньня культур. Пасьпяваў кавалак, і яго пачыналі жаць. Зжынулі і пераключаліся на другі вучастак. 30 ліпеня пачалася масавая ўборка жыта ў стане васковай сьпеласьці. На вучастках, сьпяшаючыся, размахваюць крыльлямі жнівяркі. Блішчаць на сонцы сярпы...

У першы-ж дзень вышла 6 брыгадных газэт. Яны паказвалі лепшых, цягнулі да ўзароўню перадавых адстаючых. У кожнай брыгадзе арганізавалі чорную і чырвоную дошкі. Раніцай на другі дзень вывесілі сьпісы, хто колькі вырабіў за мінулы дзень. Гэтыя сьпісы паказвалі, куды можна пасьля іх траціць, як-бы папярэджвалі калгасьнікаў. Вынікі дня былі перанесены на паперу, афармлены ў словы, лічбы.

Працавалі баявымі тэмпамі. Мяцельская Ганна пры норме ў 0,10 га зжала 0,19. Калгасьніцы слухалі і ня верылі. Пайшлі мераць, каб сваімі вачыма ўбачыць. І што-ж? — Факт застаецца фактам. Ганна зжала 0,19. Вось тут і разгарнулася сапраўднае спаборніцтва. Кожная жныя старалася дагнаць Ганну. На працу выходзілі досьвіткам, бралі больш шырокія вучасткі, каб ня штурхаць адна адну, канчалі працу позна вечарам, абедзены перапынак упчыльнялі да мінімуму. І вось вынікі. Галяс Галя, Цішкевіч Ганна, Дзячок Каця пачалі выжынаць па 0,18 га, Швыдрык Алена, Копаць Ганна, Храмцэвіч Мар'я, Астроўская Палагея, Цішкевіч Дарка —па 14-15 сотак. Кожны вечар сачылі ў брыгадным штодзенцы, хто перадавы, сачылі, каб не адстаць.

Днём у канцылярыі праўленьня калгасу нікога ня ўбачыш. Старшыня — у брыгадзе, рахункавод — сакратар калгаснай ячэйкі т. Шостак — у брыгадзе. Там у брыгадзе, на полі, сёньня вырашаецца перамога.

Пастанова РК КП(б)Б зрабіла рашучы пералом у рабоце ячэйкі. Камуністы ячэйкі калгасу «Гігант» па-баль шавіцку ўспрынялі гэту пастанову, па-дзелавому ўзяліся за працу. Скончылі ўборку азімых у 3 гадзіны 4-га жніўня.

Але гэта толькі пачатак работы, гэта першыя крокі ячэйкі і яны павінны быць замацаваны далейшай барацьбой за палянізаваньне партыйна-масавай работы ў брыгадзе, у зьвяне, за вывучэньне калгаснай вытворчасьці, за веданьне сваёй справы кожным камуністам.

В. Анэт.

Менскі гарком КП(б)Б склікае 11-га жніўня г. г. в 7-й гадз. увеч. у Доме Камасьветы (кл. Карла Маркса)

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТАКТЫВУ

—) ПАРАДАК ДНЯ: (—

Пастанова ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасьці (Дакл. тав. Шаранговіч)

Члены ЦК, ЦКК, ГК і гарКК КП(б)Б праходзяць па сваіх мандатах

Сакратары парткалектываў і ячэек КП(б)Б атрымаюць білеты 10 і 11-га жніўня ў ГК, пакой № 46 з 10 да 4-х гадз. дня

МЕНГАРКОМ КП(б)Б

РАСЬЦЕ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ КАЛГАСНАЙ РАБОТАЙ

Парторгам я быў вылучан у сакавіку гэтага году. Вёў работу на сьвінагадоўчай фэрме. Спачатку ў нас былі дзьве брыгады, потым іх зьлілі ў адну. На фэрме мы разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва паміж сьвінаркамі на лепшы догляд сьвіней. Дзякуючы старанной рабоце плян прыросту стада (па 6 парасят на кожную матку) мы выканалі. Раней быў вялікі адыход маладняка —мы давялі яго да 6 проц.

Амаль штодзенна наладжвалі чытку газэт у брыгадзе. Распрацавалі з брыгадай вынікі першай пяцігодкі, прамову тав. Сталіна аб рабоце на вёсцы і прамову на зьезьдзе калгаснікаў. Разабралі даклад тав. Якаўлева на сэсіі ЦВК. Гэта спрыяла па вышэйшаму зацікаўленасьці калгасьніц у рабоце, павысілася дысцыпліна.

Цяпер спачатку ўборачнай мяне вылучылі парторгам у другой брыгадзе. Там я толькі пачаў работу. Гутарыў аб збожжапастаўках, выдачы авансаў калгасьнікам. Раніцай праводзілі чытку газэт аб пленуме ЦК КП(б)Б.

На ўборку выйшла ўся брыгада. Жнівяркі 2-VIII зжалі 8 га, пры норме ў 6 га на дзьве жнівяркі.

Зараз праводзім абмалот збожжа.

М. Шэвц.

ЯК МЫ КІРАВАЛІ УБОРКАЙ

Хачу расказаць аб вопыце сваёй работы ў пастаяннай вытворчай калгаснай брыгадзе.

Трэба сказаць, што ў пэрыяд падрыхтоўкі да ўборкі і збожжаздачы ў калгасе і ў маёй брыгадзе адсутнічала баявая мабілізацыя мас калгасьнікаў на ўборку ўраджаю.

Пералом у кіраўніцтве калгасам паступіў пасьля нашага дакладу на бюро раённага камітэту партыі. Там нам паказалі, навучылі нас, што рабіць, каб атрымаць перамогу ў галоўным баі за сацыялістычны ўраджай.

У маёй (трэцяй) брыгадзе—я адзін камуніст — парторг і адзін камсамолец — брыгадны агітатар Барысавец Аляксей. Перад пачаткам жніва мы сумесна з брыгадзірам растлумачылі кожнаму калгасьніку задачы, якія стаяць перад нашай брыгадай у часе ўборкі ўраджаю, колькі і чаго мы павінны зрабіць, колькі машынамі, колькі сярпамі і за які тэрмін. Нормы выпрацоўкі мы давялі да кожнага калгасьніка, растлумачылі, што чым хутчэй і лепш убярем мы ўраджай, чым менш мы пакінем на полі калосьсяў і збожжа, тым хутчэй мы выканаем абавязкі перад дзяржавай і самі больш атрымаем на працадзень.

І калі ў першы дзень вышлі жаць, калгасьніцы добра ведалі свае нормы, аплату працы. Гэта адыграла вялікую ролю.

З першага-ж дня жніва мы арганізавалі выпуск брыгаднай штодзенкі, зрабілі чорныя і чырвоныя дошкі. Яны паказвалі перадавых змагароў за ўборачную, падцягвалі адстаючых.

Наколькі дапамагае брыгадная штодзенка, паказвае хоць-бы такі факт. Калгасьніца-жныя Казубовіч Ульяна ў першы дзень жніва позна вышла на працу, ня выканала сваёй нормы. Уве чары вышла штодзенка. Казубовіч убачыла сябе. На другі дзень і ў наступныя дні жніва яна ўжо больш не спазьнялася на работу і пры норме 0,10 жала 0,14 га.

Насьцешаецца прачытваецца ў полі па ўборцы. На месцы збору вісяць чорная і чырвоная дошкі. Апрача гэтага кожны дзень раніцою на фанэрнай дошцы вывешваецца сьпіс, хто і колькі выпрацаваў за мінулы дзень. Гэта ня чорная і ня чырвоная дошка.

Зьвеньні ў брыгадзе спаборнічаюць паміж сабою, вынікі спаборніцтва штодзенна падводзяцца пры абмеры праробленай за дзень работы. Нярэдкі былі выпадкі, калі калгасьніцы самі хадзілі правяраць абмер, якасьць працы ў зьвяне, з якім спаборнічаюць.

Людзі выходзілі на працу з сонцам, абедзены перапынак упчыльнялі да мінімуму і позна вечарам варочаліся з работы. Кожны стараўся перавыканаць сваю норму, як мага хутчэй і больш старанна ўбраць ураджай.

Кожны вечар сакратар нашай калгаснай ячэйкі рабіў інструктаж парторгам і брыгадным агітатарам, што мы павінны рабіць на заўтра.

Раніцою на зборы перад пачаткам работ мы робім 10-мінутную палітзарадку. Я або Барысавец Аляксей расказваем калгасьнікам або зачытваем галоўнае, важнейшае з учарашніх газэт.

У абедзены перапынак праводзім чытку газэт, прапрацоўваем важнейшыя пастановы партыі і ўраду. Зараз прапрацоўваем (трэба прызнацца, што з вялікім спазьненьнем) адозву і самаабавязацельствы II усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

ЮРКЕВІЧ РАМАН,
парторг 3-й брыгады калгасу «Гігант».

АРГАНІЗАВАНА ПРАЦА

Да маёй брыгады быў прымацован парторгам т. Шостак і ад камсамольскай ячэйкі Барысавец Міша. Праца ў часе ўборкі нам прадстаяла вялікая. Перш чым прыступіць да ўборкі, я з парторгам і камсамольцам Барысаўцом разьбіў брыгаду на чатыры зьвяны па 8-10 чалавек у зьвяне. Для кіраўніцтва зьвеньнямі мы вылучылі 4 зьвеньнявых — аўтарытэтных пажылых жанчын, добрых гаспадынь. Гэта, ў значнай ступені дапамагае мне кіраваць брыгадай, бо ў зьвяне лепш можна ўлічыць працу, зацікавіць калгасьніц у павышэньні прадукцыйнасьці працы. У зьвяне, дзе працуюць 8-10 чалавек, лепш бачыш тых, хто ідзе ўперадзе і тых, хто хоча трохі пагультаяваць. Тут усё ўсплывае па чыстую ваду.

Перад пачаткам уборкі мы растлумачылі кожнай калгасьніцы, што норма зжаць 0,10 га і што яна за гэта атрымае 1,75 працадня. Разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва ў зьвеньнях. Праўда, асобныя калгасьніцы паміж сабой сваё спаборніцтва не афармлялі дагаварамі, заключылі іх вусна і вечарам, калі скончылі работу, калі абмерылі зробленае за дзень, падвялі вынікі, было відаць, хто і колькі выпрацаваў. Гэта ў нас і было праверкай таго, як выконваюцца дагавары па сацспаборніцтве.

Трэба сказаць, што нормы перавыконваліся. Калгасьніцы Швідрык Алена, Копаць Ганна, Храмцэвіч Мар'я, Астроўская Палагея, Цішкевіч Дарка выжыналі па 14-15 сотак. Жалі добра. Ні адзін чалавек не адставаў. Чорная дошка пуставала. Ды і ня дзіва, мая брыгада першай у калгасе скончыла жніво жыта.

Гэтага мы дабіліся таму, што ўлічвалі ўсе наймалейшыя недахопы і тут-жа на месцы хутка іх выпраўлялі. Напрыклад, раніцою пры расстаноўцы зьвеньняў, калі адвядзем ім вузкія вучасткі, яны трушча бок аб бок, адна аб другую, чакаюць, а тут дорага кожная хвіліна. Я зрабіў так, на кожную жныю адвёў чатыры мэтры. Месца хопіць, толькі працуй. І сапраўды, працуюць, маланкай праца ідзе.

Работу пачыналі на полі раней, чым сонца ўзыходзіла, а іншы з работы тады, калі наступала вячэрняя прахалода.

Вялікую дапамогу мне аказала брыгадная штодзенка, яна як-бы падпавала жаданьне калгасьніка працаваць па-ўдарнаму, перавыконваць свае нормы. Траціць у газэту за недобрасумленныя адносіны да працы, за невыкананьне норм выпрацоўкі — лічыцца самай найганьбнай ганьбай.

Шмат у чым дапамагалі мне парторг тав. Шостак і камсамолец Міша. Яны штодзенна былі ў брыгадзе, праводзілі чыткі газэт, прапрацоўвалі з калгасьнікамі важнейшыя пастановы партыі і ўраду.

Мая чацьвертая брыгада першай скончыла жніво азімых. Спадзяюся, што першай яна будзе і па ўборцы яравых і ў выкананьні абавязкаў перад дзяржавай.

ПРАДНІК РАМАН,
брыгадзір 4-й брыгады калгасу «Гігант».

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСІ на ЧЫСТЦЫ

пачатку праверкі радоў КП(б) Беларусі назіралася слабая падрыхтоўка чысткі ў радзе ячэек і раёнаў. Шмат праверачных сходаў народка валіся з-за слабай партыйцаў і беспартыйных. Некаторыя райкомы абмежаваліся пытаньне аб чыстцы пасьля і на гэтым супакоіліся.

Пасьля далейшым, дзякуючы рабоце рэспубліканскай камісіі, вялікай дапамозе ў правядзеньні чысткі з боку Цэнтральнага Камітэту КП(б)Беларусі і дзякуючы рабоце, якая праводзіцца месцах самімі камісіямі па чыстцы, уся работа па чыстцы рэзка палепшылася.

Партыйцы і шырокія беспартыйныя масы рабочых і калгасьнікаў прымалі ўдзел на сходах, шырокі распагнулася здаровая, бальшавіцкая самакрытыка, масы дапамагаюць выкінуць чужыя і прымазаўшыяся да партыі элементы, дапамагаюць усякіх недахопы ў рабоце парторганізацый.

На заводзе «Камінтэрн» у Віцебску ня па чыстцы наведвалі ня толькі амалоўна ўсе камуністы, але і каля 0 проц. беспартыйных рабочых. На чыстцы вясковых ячэек прысутнічалі на сходах, дзе правяраецца ня партыйцаў, у сярэднім ня менш 150 беспартыйных, а часта і больш. У Мазырскім раёне ў часе правяраецца асобных камуністаў выступала ад 20 чалавек. У большасьці выступленьні носяць дзелавы характар.

У сувязі з чысткай узмацнецца ўзмацнілі палітычнай і вытворчай актыўнасьці партыйцаў і беспартыйных. У Менску на машынабудаўнічым заводзе «Камунар» у маі прамфінплян выканан на 102,8 проц. У чэрвені, у порыве падрыхтоўкі і самой чысткі, назіраўся яшчэ большы ўздым вытворчага энтузіязму. Прамфінплян за чэрвень выканан ужо на 124,4 проц. Палепшылася якасьць прадукцыі, зьнізіўся брак. Цэхі, якія залежаць адзін ад другога па вытворчай лініі, узаемна прадпісалі сацыялістычныя ралуткі на выкананьне тэрміновых заказаў. У Віцебску на шаўчоцна-трыкатажнай фабрыцы імя КІМ у часе чысткі арганізавана 10 новых ударных брыгад.

У Кавалеўскім сельсавеце, Бабруйскага раёну, пасьля абвяшчэньня вываду аб чыстцы ячэйкі ў калгас зацвіліся 32 аднаасобнікі.

Гэтыя факты—яркі паказальнік поўнага ўхваленьня і падтрыманьня палітыкі партыі шырокімі масамі працоўных.

У працэсе чысткі прыходзіцца, аднак, сутыкацца са слабай падрыхтоўкай да чысткі паасобных ячэек, з адрывам чысткі ад гаспадарча-палітычных задач. У Гомелі ячэйка Палесдрэву зусім не падрыхтавалася да чысткі, частка камуністаў не наведвала нават сходаў па чыстцы, самакрытыка ня была разгорнута.

Клясава-варожыя элементы дзе-ніадзе прабавалі скарыстаць чыстку ў мэтах кампрамэтацыі прыкладных камуністаў і самой ідэі чысткі. У Мазырскім раёне пры чыстцы старшыні сельсавету тав. Рахуба Аркадзя выступіў выключаны з калгасу былы бандыт Панцялеў з абвінавачваньнем Рахуба ў атрыманьні хабару. Тут-жа на сходзе выступіўшыя беспартыйныя калгасьнікі і камуністы выкрылі паклёпніка. У Веткаўскім раёне, каб дыскрэдытаваць камісію па чыстцы, выключаны з партыі Сокалаў і Каршуноў пашырылі ілжывыя чуткі аб сувязях членаў камісіі з кулакамі.

* * *

Чыстка ў Беларусі адбываецца ў 1.775 ячэйках, з іх у 772 чыстка ўжо закончана. Усяго да 1 жніўня прайшлі чыстку 14.384 члены і кандыдаты партыі. З ліку прайшоўшых праверку выключана з партыі каля 20 проц., пераведзена ў кандыдаты 8 проц. і ў спачуваючыя—каля 12 проц. Найбольшы процант выключаных— у Горацкім раёне—28, і значна на меншы ў Асьвейскім раёне — 10.

Наяўнасьць у КП(б)Беларусі значнай колькасьці выхадцаў з буржуазных нацыяналістычных партый адчуваецца і ў ходзе чысткі. Выяўляецца, што рад выхадцаў з контр-рэвалюцыйных нацыяналістычных партый—нацдэмы, бундаўцы і інш.—ня толькі не парвалі са сваім мінулым, але часта прабуюць скарыстаць чыстку для ідэалізацыі контр-рэвалюцыйных нацыяналістычных партый. Праверкомы бязьлітасна выкрываюць усе махінацыі гэтых элементаў, праводзяць вялікую растлумачальную работу аб контр-рэвалюцыйнай сутнасьці гэтых партый. У мэтах дыскрэдытацыі чысткі некаторыя былыя бундаўцы пашыраюць чуткі аб тым, што нібыта «ўсе былыя бундаўцы будуць выключаны з партыі»...

У працэсе чысткі выявілася яўна незадавальняючая пастаноўка марксыцка-ленінскага выхаваньня: значны процант ня толькі кандыдатаў, але і членаў партыі ня ведае асноўных пастаноў партыі, ня чытае газэт, ня ведае праграмы і статуту. Асабліва гэта назіраецца ў сельскіх ячэйках.

* * *

Праверкомы на месцах праводзяць вялікую арганізацыйна-масавую работу: склікаюць нарады сакратароў ячэек (Менск, Віцебск, Гомель, Ворша, Плешчаніцы і інш.), нарады рэдактараў газэт, сходы партактыву і камсамольскіх арганізацый.

У Віцебску арганізавана 14 арганпатрыёт для сыстэматычнага інструктажу і дапамогі ячэйкам у падрыхтоўцы да чысткі. У Менску на многіх заводах праведзены сходы старых рабочых—герояў пяцігодкі, дзе абмяркоўваліся пытаньні іх актыўнага ўдзелу ў чыстцы. Многія раённыя камісіі, як турэўская, старобінская, для характарыстыкі работы ячэек і камуністаў ходзяць па палёх і знаёмяцца са становішчам ураджаю, яго аховай, якасьцю палявых работ і г. д.

Паасобныя праверкомы, аднак, усё яшчэ дапускаюць у сваёй рабоце памылкі. Бягомльская раённая камісія вынесла, напрыклад, такую пастанову: «Хмаленко В. І. за сыстэматычнае п'янства, за падробку подпісу на ведамасьцях на атрыманьне ашчаднага чынам грошай, за ненаведваньне партыйных сходаў—перавесьці ў спачуваючыя»...

Вялікім недахопам у рабоце праверкомаў зьяўляецца тое, што вывады аб результатах чысткі часта носяць агульны, неканкрэтны характар.

Яшчэ адна адказная задача, якая павінна вырашацца пры актыўнай садзейнасьці праверкомаў, — гэта выяўленьне ў часе чысткі новага моцнага партыйнага і беспартыйнага актыву. Трэба ўлічваць гэты актыў для таго, каб праз партыйныя камітэты высоўваць яго на кіруючую работу.

Такі актыў бязумоўна ёсьць, аднак, ён часта застаецца ў «цені». Член бабруйскай раённай камісіі па чыстцы тав. Андрэйчыкава здолела ў часе чысткі на вёсцы вылавіць вялікі актыў жанчын, членаў партыі. Так, у асавецкай ячэйцы калгасьніца, член партыі Каця Лемяшонак, якая працуе на сьвінагадоўчай фэрме, аказалася больш палітычна пісьменнай, ведаючай задачы партыі па рабоце ў вёсцы, чым сакратар ячэйкі і старшыня сельсавету. На прапанову камісіі аб вылучэньні яе работнікі райкому адказалі, што «з гэтай справай сьпяшацца ня трэба—ня вам, а нам прыдзецца працаваць».

У результаце чысткі ў КП(б)Б ёсьць значны зрух у пастаноўцы ўсёй партыйнай і гаспадарчай работы. Павысілася партыйная і савецкая дысцыпліна, рэвалюцыйная пільнасьць і бальшавіцкая партарганізацыі. На вёсцы рост зацікаўленасьці партыйцаў вучобай.

Чыстка мабілізуе партарганізацыю і беспартыйныя масы на своечасовае правядзеньне ўборкі і здачы збожжа дзяржаве.

Задача партыйных камітэтаў заключаецца ў тым, каб зараз-жа, не чакаючы канца чысткі, разгарнуць марксыцка-ленінскае выхаваньне партыйцаў, неадкладна арганізаваць выхаваўчую работу ў групах спачуваючых. Павінна быць таксама шырока разгорнута выхаваўчая работа і сярод пераведзеных у кандыдаты партыі.

П. САХАРАВА.
(Член беларускай рэспубліканскай камісіі па чыстцы).

(«ПРАВДА»).

Пастанова рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б

1. Зацьвердзіць раённую камісію па чыстцы БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ райпартарганізацыі ў складзе наступных т. т.:

Старшыня — РЫНГ В. І. член партыі з 1917 г., рабочы, работнік ПП АДПУ Бел.; члены КІЦІКАЎ І. К., член партыі з 1918 г., служачы, загадчык Бабруйскага рабфаку; ЧАРНЯЎСКІ А. Г., член партыі з 1925 г., рабочы, старшыня Буда-кашалёўскай райКК КП(б)Б.

2. Членам раённай камісіі па чыстцы АСІПАВІЦКАЙ райпартарганізацыі замест тав. МАРУСЭВІЧА назначыць тав. ВАЛАХНЯНСКАГА Х. Я., член партыі з 1924 г., рабочы, член ЦК КП(б)Б, нам. дырэктара заводу імя Вар

Тав. Любімаў на прадпрыемствах Віцебску і Гомелю

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

8 жніўня раніцой тав. ЛЮБІМАЎ прыбыў у ВІЦЕБСК. З вакзалу наркам накіраваўся на буйнейшыя прадпрыемствы гораду. Яго суправаджалі прыехаўшыя з ім нач. галоўнага кіраўніцтва швейнай прамысловасьці СССР, тав. КУГЛАНАЎ, нам. нач. галоўніраўніцтва трыкатажнай прамысловасьці т. ВАЛЬФСОН і нам. Наркамлёгпраму БССР тав. КАЦ, а таксама сакратар Віцебскага гаркому КП(б)Б тав. ЖУРАЎЛЁЎ і старшыня гарсавету тав. БАСКІН.

На швейнай фабрыцы «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» прыезд тав. Любімава быў нечаканы. Таму ўсё ішло звычайным парадкам, правільней, звычайным НЕПАРАДКАМ.

Прыбыхшыя да «дробных» непарадкаў трыкутнік фабрыкі і загадчыкі цэхаў зараз ня ведалі, куды дзецца ад сораму. А праз гадзіну яны ўжо сядзелі на нарадзе ў габінэце дырэктара і слухалі дакорлівыя словы наркома:

— Гэта ганьба, каб такая магутная новая фабрыка — гонар лёгкай прамысловасьці БССР, пабудаваная сіламі пралетарыяту ўсяго Савецкага союзу, працавала з такімі прарывамі. У вас няма самага элементарнага — парадку і чыстоты ў цэхах, у сталовай. Людзі не адчуваюць адказнасьці за даручаным участкі.

Фабрыка «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» выканала поўгадовую праграму толькі на 63 проц. У ліпені дасягнут поўны пералом — месячны план выкананы на 94 проц. Аднак, гэты пералом яшчэ не замацован, і зараз фабрыка стаіць зноў перад пагрозай прарыву.

Асноўныя прычыны адставаньня фабрыкі зьяўляецца невыкананьне 6-ці ўмоў тав. СТАЛІНА. На фабрыцы яшчэ слабая працоўная дысцыпліна, не пікіцдаваны абязьлічка, цякучасьць рабочай сілы. Частка камуністаў і беспартыйных рабочых адносяцца нядбайна да сваёй работы.

Недапушчальная забруджанасьць цэхаў, сталоўкі кідаецца ў вочы кожнаму прышоўшаму на фабрыку. Гэта забруджанасьць прыводзіць да павялічэньня браку, пагоршэньня якасьці прадукцыі зьмяншэньня колькасных і якасных паказальнікаў выкананьня прамфінпляну.

На фабрыцы «КІМ» тав. ЛЮБІМАЎ выявіў абураючую безгаспадарчасьць: з-за нераспарадчасьці і невыкананьня дырэктарам тав. ФРЭЙДЗІНЫМ дырэктыў Наркамлёгпраму БССР на фабрыцы, пры наяўнасьці ўсіх магчымасьцяй, стаіць нескарыстаным і нават незамантаваным прыбыўшае два месяцы назад абсталяваньне — 200 новых панчошных варштатаў, 100 варштатаў устаноўлены, але дагэтуль яшчэ не асвоены фабрыкай.

Бруд таксама, як і на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», павышае процант браку і на «КІМ'е». Пад машыны ні кяма спэцыяльных скрынак для выробленых панчох. Негатовая яшчэ прадукцыя трапляе на забруджаную і зашмальцаваную падлогу і псуецца. Устаноўка такіх скрынак нічога складанага сабой не прадстаўляе і не патрабуе ніяк ніякіх затрат. Толькі бястурботнасьць і неахайнасьць кіраўніцтва фабрыкі, адсутнасьць ініцыятывы ў загадчыкаў цэхаў тармозяць правядзеньне гэтага «дробязнага» мерапрыемства.

І тут НАРКОМУ прышлося доўга паказваць фабрычнае кіраўніцтво, на канкрэтных прыкладах паказваць, як трэба дэтальна, выразна кіраваць работай. Толькі глыбокае ўваходжаньне ў кожную дробязь жыцьця фабрыкі, толькі штодзённы сыстэматычны нагляд за кожным варштатам, за кожным працэсам работы, ліквідацыя найдрабнейшых недахопаў могуць забясьпечыць ціхую работу фабрыкі, выкананьне прамфінпляну як па колькасьці, так і па якасьці.

НАРКОМ наведаў яшчэ фабрыку імя КЛАРЫ ЦЭТКІН, дзе таксама завастрыў увагу дырэкцыі, парткалектыву і фабзаўкому на радзе недахопаў у рабоце прадпрыемства.

Пасьля гэтага т. Любімаў прысутнічаў на нарадзе гаспадарнікаў пры гаркоме КП(б)Б, на якой выступіў з прамовай аб становішчы і задачах лёгкай прамысловасьці ВІЦЕБСКУ. У спрэчках выступалі нач. галоўкіраўніцтва швейнай прамысловасьці т. КУГЛАНАЎ, нам. Наркамлёгпраму БССР тав. КАЦ, сакратар гаркому КП(б)Б т. ЖУРАЎЛЁЎ, старшыня гарсавету т. БАСКІН, прадстаўнікі фабрык і заводаў.

Вечарам т. ЛЮБІМАЎ выехаў у Гомель.

***

7-га жніўня з самай раніцы тав. ЛЮБІМАЎ накіраваўся на новапабудаваную МЭХАНІЗАВАНУЮ ГУТУ. Тут нарком падрабязна азнаёміўся з усімі аб'ектамі будаўніцтва, з працэсам вытворчасьці, агледзеў жылкі рабочы пасёлак, пабудаваны пры заводзе, наведаў сталоўку, цікавіўся матар'яльна-бытавымі ўмовамі рабочых.

Потым НАРКОМ на пятучай нарадзе гаспадарнікаў — кіраўнікоў заводу выявіў усё неабходнае для скансэньня будаўніцтва гуты і для пуску яе ў бліжэйшы час. Уважліва абмеркаваўшы і запісаўшы ўсе запатрабаваньні заводакіраўніцтва, нарком абяцаў аказаць усямерную дапамогу для хутчэйшага пуску гуты.

З гуты тав. Любімаў разам з сакратаром Гомельскага гаркому КП(б)Б тав. ШАФАРЭНКА, старшынёй гарсавету тав. РАЧЬЦКІМ, нам. наркамлёгпрама т. КАЦАМ выехалі на завод «ЧЫРВОНЫ ХЭМІК».

Становішча гэтага заводу можа служыць прыкладам, як нельга працаваць, як нельга кіраваць прадпрыемствам. У двор заводу нельга ўвайсьці: усюды загароджана, завалена сырцом, трэскамі, уціпем, вугалем і г. д. Вапна, дапаміт, вугаль— усё зьмешана ў кучы і валяецца па ўсім дворэ.

Чаму такі непарадак?

Аказваецца, заводакіраўніцтва ня можа навербаваць 20-30 рабочых для прыязджэньня ў парадзе заводзкага двара.

І дырэктар, і яго намесьнікі разводзяць бездапаможна рукамі. Вялікая цякучасьць рабочай сілы разьядае завод. За вдзён месяц на завод прыходзяць і адыходзяць каля 300 рабочых, а ўсяго тут працуе стопякі-ж. Такім чынам цякучасьць рабочай сілы складае 100 проц.

Тав. ЛЮБІМАЎ даў канкрэтныя ўказаньні заводакіраўніцтву і патрабаваў, каб на працягу 5-6 дзён завод быў пры водзен у нармальны стан. Нарком папярэдзіў, што праз месяц ён праверыць выкананьне свайго распараджэньня.

Наведаўшы яшчэ запалкавую фабрыку «ВЭЗУВІ», тав. Любімаў накіраваўся ў гарком КП(б)Б на нараду гаспадарнікаў прадпрыемстваў пёгкай прамысловасьці Гомелю. Тут НАРКОМ, заслухаўшы рад інфармацый дырэктараў прадпрыемстваў, выступіў з прамовай аб задачах перабудовы работы пёгкай прамысловасьці.

Адзін з найбольш слабых вучасткаў на радзе фабрык і заводаў Гомелю— дрэнная якасьць прадукцыі. Вось для прыкладу швейная фабрыка «КАМІНТЭРН». Зусім надаўна за дрэнную якасьць прадукцыі быў закрыт на месяц ЦЭХ БЯЛІЗНЫ. Зараз цэх зноў адкрыт, але якасьць прадукцыі ўсё-ж не палепшылася.

Што робіць кіраўніцтва фабрыкі, што прадпрыймаюць загадчыкі цэхаў? Яны займаюцца тым, што скардзяцца на тэкстыльныя фабрыкі на дрэнную якасьць сырцу.

— Якая фабрыка прысылае вам дрэнную прадукцыю,—пытаецца тав. ЛЮБІМАЎ у дырэктара фабрыкі т. РАХНОВІЧА.

Адказу няма. Дырэктар ня ведае, на каго ён скардзіцца, да каго прад'яўляе прэтэнзіі. Як-жа можна змагацца за якасьць прадукцыі, ня ведаючы ад каго атрымліваеш дрэнны сырэц, якая фабрыка павінна адказваць за дасланую нядобраякасную прадукцыю?..

НАРКОМ узяў у рукі бацінкі—прадукцыю гомельскай абутковай фабрыкі «Праца»—і прадэманстраваў наглядна недахопы гэтай прадукцыі. Абутак, які выдаецца за першы і другі гатунак, фактычна зьяўляецца бракам. Гэта вынік абсалютна дрэннай барацьбы за якасьць з боку трыкутніка фабрыкі і ўсяго фабрычнага калектыву.

Гаспадарнікі гомельскіх прадпрыемстваў у адказ на прамову тав. ЛЮБІМАВА ў сваіх выступленьнях абяцалі рашуча ўзяцца за перабудову работы прадпрыемстваў, узмацніць барацьбу за якасьць прадукцыі.

Прыезд тав. ЛЮБІМАВА павінен быць выкарыстан для мабілізацыі рабочых мас на барацьбу за ажыцьцяўленьне апошніх пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК аб рабоце прамысловасьці.

С. Галкін.

Партнарада гаспадарнікаў лёгкай прамысловасьці БССР

Учора ў ЦК КП(б)Б у сувязі з прыездам народнага камісара лёгкай прамысловасьці СССР тав. Любімава адбылася партыйная нарада гаспадарнікаў лёгкай прамысловасьці БССР.

Нарадай кіраваў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало.

Нарада заслухала паведамленьне тав. Любімава. Тав. Любімаў, указаўшы на вялізарны рост лёгкай прамысловасьці БССР за гады рэвалюцыі, адначасова падкрэсьліў нездавальняючую яе работу, асабліва ў першым паўгодзьдзі бягучага году.

Тав. Любімаў прывёў рад фактаў дрэннай работы прадпрыемстваў Менску, Віцебску і Гомелю, якія ім былі наведаны. Апрача нездавальняючага становішча на радзе прадпрыемстваў у галіне арганізацыі вытворчасьці і кіраўніцтва ёю, тав. Любімаў з асаблівай сілай падкрэсьліў адсутнасьць культурных адносін да работы і клопатаў аб «дробязях» быту і ўмоў жыцьця і працы рабочых з боку трыкутнікаў прадпрыемстваў.

Вялікую ўвагу ў сваім выступленьні тав. Любімаў аддаў мэтадам кіраўніцтва прадпрыемствамі з боку Наркамлёгпраму БССР і яго трэстаў і выступіў пытаньне аб спрашчэньні апарату кіраўніцтва, у прыватнасьці лік відацыі асобных трэстаў і стварэньня галоўных кіраўніцтваў наркамату па кожнай галіне прамысловасьці.

Пасьля выступленьня т. Любімава разгарнулася спрэчкі, якія паказалі, што як Наркамлегпрам і яго трэсты, так і самі прадпрыемствы яшчэ практычна нічога не зрабілі ў напрамку рэалізацыі пастановы лішеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасьці.

У канцы нарады з прамовай выступіў тав. Гікало. Асноўны ўпор у сваёй прамове тав. Гікало зрабіў на сапоўна-панскіх, канцылярска-бюракратычных мэтадах кіраўніцтва як з боку гаспадарчых аб'яднаньняў, так і самога Наркамлегпраму БССР.

Тав. Гікало заклікаў усіх гаспадарнікаў па-баявому ўзяцца за бальшавіцкую рэалізацыю пастановы пленуму ЦК і ЦКК, каб вывесьці лёгкую прамысловасьць БССР з глыбокага прарыву і з посьпехам выканаць прамфінплян першага году другой пяцігодкі як па колькасных, так і асабліва па якасных паказальніках.

АД РЭДАКЦЫІ: Стэнаграма выступленьня т. Любімава будзе зьмешчана ў бліжэйшым № газэты.

За нявыплату мэтавых авансаў—да адказнасьці

На падставе пастановы Камісіі выканаўчага пры СНК СССР ад 29 ліпеня 1933 г. прыцягнуты да адказнасьці за нявыплату мэтавых авансаў старшыня ВРК добрускай фабрыкі (Гомель), старшыня ВРК дрэваапрацоўчага камбінату (Вабруйск), старшыня ВРК фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» і «Дзьвіна» (Віцебск). Арыштаваны з чалавека пяць вымоганых: торфрабкопу, электрастанцыі (Менск). Сьледства па гэтай справе закончана і перадана ў суд. Справа ВРК фабрыкі «Дзьвіна» прызначана слуханьнем у судзе 7-УШ-33 г.

За нескалачасовую інфармацыю пракуратуры рэспублікі аб ходзе расьсьледваньня гэтых спраў пракурорам Гомелю, Віцебску і Вабруйску абвешчана:

За хутчэйшую рэалізацыю пастаноў СНК і ЦК аб чыгуначным транспарце

У АРШАНСКІМ ЭКСПЛЁАТАЦЫЙНЫМ РАЁНЕ ГРУБА ІГНАРУЮЦЦА СЫГНАЛЫ „ЗЬВЯЗДЫ"

«Зьвязда некалькі раз сыгналізавала аб апартуністычным самасупакоі і простым сабатажы рэалізацыі пастаноў СНК і ЦК аб чыгуначным транспарце ў Аршанскім райкіраўніцтве. Мы паказвалі на факты саноўна-панскіх мэтадаў кіраўніцтва партарганізатара раёну тав. Батвы.

Што-ж адбылося пасьля гэтых сыгналаў? Якія меры прыняты райкіраўніцтвам, каб сапраўды забясьпечыць поўную перабудову работы, каб ліквідаваць дацупчаныя недахопы, каб мабілізаваць шырокія масы чыгуначнікаў на ўдзел у перабудове, на выкананьне вытворчых паказальнікаў?

Артыкулы «Зьвязды» ад 20, 30 і 31 ліпеня ня былі абгавораны на партыйных сходах, не гаворачы ўжо аб сходах рабочых. Аднак да гэтага часу сабатажнікі рэалізацыі пастаноў СНК і ЦК (Калюжны, Касарэвіч, Ларын, Шах і інш.) не пакараны. Яны спакойна сядзяць у габінэтах і мала клапоцяцца аб рабоце нізавых зьвеньняў. Начальнік плянава-фінансавага аддзелу раёну Калюжны не паслаў да гэтага часу ні аднаго работніка на лінію, сарваў складаньне балянсу на 1-га жніўня. Аднак, ніякіх мер супроць яго ня прынята. Ніхто не рэагаваў і на апартуністычнае выступленьне памочніка начальніка раёну Зантовіча на сходзе парт'ячэйкі райкіраўніцтва, які дэмабілізаваў сход, заявіўшы, што перабудова ўжо закончана.

Трыкутнік раёну (начальнік Зейліковіч, парторг Батва, старшыня райпрафсачу Чыневіч) абыйшоў сыгналы «Зьвязды», нічога канкрэтнага не зрабіў для ліквідацыі недахопаў у рабоце, для ліквідацыі старых мэтадаў кіраўніцтва, для выкараўленьня дапушчаных грубых палітычных памылак.

Ці ёсьць падставы для самасупакоі насьці трыкутніка? Магчыма, сыгналы былі няправільныя, магчыма пераабудова сапраўды закончана? Нічога падобнага. Стан рэчаў не дае права ні на мінуту самасупакоіцца. Перабудова работы раёну па-ранейшаму не пасунулася ні на крок. Аб гэтым ясна паказваюць факты і лічбы выкананьня вытворчых заданьняў за апошні час.

Пагрузка хоць і вышэй нормы на 11 проц., але гэта ня можа лічыцца дасягненьнем, бо яна выключна ідзе за кошт перавышэньня вагоннага парку раёну. На 4-га жніўня раён меў перавышаны парк на 440 вагонаў. Такое ненармальнае становішча зусім ня трывожыць трыкутнік раёну. Ён на гэта не рэагуе.

Ёсьць значнае перавышэньне нормы вагонаў пад выгрузкай. Астача пад выгружкай складае 30,5 проц. пры заданьні 16. Асабліва дрэнная работа менскага вузла. Тут сыстэматычна зрываецца выкананьне асноўных вытворчых вымяральнікаў. Інструктар парторга Міронаў і прадстаўнік райпрафсачу Сальман, якія сядзяць на вузьле, не забясьпечылі пералому ў рабоце.

Па-ранейшаму дрэнны стан працдысцыпліны. 31 ліпеня намесьнік начальніка станцыі Менск Лапчынскі ня выканаў загаду дыспэтчара аб тэрмі новым прасоўваньні 17 пляцформаў, прызначаных для пагрузкі імпарту ў Негарэлае. 2-га ліпеня намесьнік начальніка станцыі Ворша-ўсходняя Маленкина сарваў адпраўленьне цягніка № 784 на Віцебск з прычыны... несваячасовага падбору дакумантаў. Рэгуляваньне пагрузкі, якая мае мэтай дабіцца яе павышэньня пры адначасовым зьнижэньні парку рабіцца, сыстэматычна парушаецца станцыямі. 2-га ліпеня ў Менску начальнік станцыі Фралоў замест дазволеных да пагрузкі (у межах МББ чыгункі) 10 вагонаў пагрузіў 28.

Такіх фактаў расхлябанасьці, грубых парушэньняў працоўнай дысцыпліны можна прывесьці значна больш. Аднак, на іх ніхто па-бальшавіцку не рэагаваў.

Як стаіць справа з апэрацыйным кіраўніцтвам ходам перабудовы? Райпрафсач і парторг абмежаваліся пасылкай некалькіх чалавек на лінію, але яны нават ня ў курсе таго, што пасланыя там робяць, не наладзілі жывой апэрацыйнай дапамогі і кантролю работы нізавых зьвеньняў. Інспэктары шляху і вагоннай гаспадаркі пры райкіраўніцтве яшчэ сядзяць у габінэтах, ня кіруюць перабудовай на месцы.

Камэнтары, як быццам, лішнія. Ясна адно, што сабатаж перабудовы ў Аршанскім раёне ня спыняецца. За хапіўшыся фармальнай перабудовай, а не перабудовай на сутнасьці, не зьмяніўшы мэтадаў работы і кіраўніцтва, трыкутнік раёну самасупакоіўся, фактычна пакрывае сабатажнікаў, ігнаруе правільныя сыгналы друку.

Аршанскі райком партыі да апошняга часу не заняўся пытаньнем перабудовы работы транспарту, ня ўдарыў па сабатажніках перабудовы.

Брыгада «Зьвязды»: В. Грыгор'еў, Я. Якаўлеў.

АД РЭДАКЦЫІ. «Зьвязда» патрабуе неадкладнага рэагаваньня з боку Аршанскага РК КП(б)Б на матар'ялы, якія зьмешчаны ў друку. Адначасова рэдакцыя перадае ўсе матар'ялы ў ЦКК-РСІ Бел. для прыцягненьня сабатажнікаў да суровай адказнасьці.

Сядзяць у габінэтах

Пленум ЦК чыгуначнікаў, які пядаўна закрыўся, пастанавіў неадкладна накіраваць усіх кіруючых работнікаў ЦК саюзу, дарпрафсачаў і райпрафсачаў на лінію для дапамогі ў рэалізацыі пастаноў СНК і ЦК УсеКП(б).

Гэта пастанова пленуму ня выканана Жлобінскім райпрафсачам.

Усе адказныя работнікі райпрафсачу сядзяць у канцыляры і спадзяюцца на тое, што рэарганізацыя пройдзе сама.

Прыяжджалі на лінію толькі старшыня райпрафсачу Мандрык і інструктар Непакайчыцкі і то былі там з 18 па 20-ае жніўня, толькі Міхайлоўскі — з 20 па 25, Пугач з 20 па 29 ліпеня. Астатнія работнікі: члены прэзыдыуму Вожык, Кавалёў, Сінюковіч і аслабанёныя работнікі Закжэўскі, Просаў, Звалінскі, Яўзерзаў «працуюць» на Жлобінскім вузьле седзячы ў габінэтах.

Увесь час праходзіць у іх засядацельскай мітусьні. Камісіі, мітынгі, сходы, фракцыі, прэзыдыумы і інш. — вось і ўся работа. Райпрафсач атрымаў тэлеграму накіраваць на нізавую прафработу 3-х адказных работнікаў, але-ж яна недзе згубілася...

Усё гэта сьведчыць аб апартуністычнай недаацэнцы работы па рэалізацыі пастаноў партыі і ўраду аб чыгуначным транспарце.

Адпаведныя вывады з гэтага павінен зрабіць Жлобінскі РК КП(б)Б.

Д. БАНЬКЕВІЧ.

У Жлобіне злачынна ігнаруюць лісты і скаргі працоўных

У Жлобінскім РКК РСІ, на чале якой раней стаяў тав. Федаровічык, справа рэагаваньня на лісты і скаргі рабочых знаходзіцца ў апчаянным становішчы. Дзесяць допісаў згублена, сем допісаў пераслана іншым арганізацыям для рэагаваньня і ніхто ня ведае аб іх лёсе. Шэсьць допісаў знаходзіцца ў партфолях або кішэнях работнікаў РКК РСІ—«у стадыі расьсьледваньня» і толькі невялікая колькасьць допісаў пашла пад руку пядаўна прыехаўшаму на пасаду старшыні РКК РСІ тав. Дзейко, які і даручыў персанальна асобным работнікам тэрмінова расьсьледваць скаргі.

Дрэнна з гэтай справай і ў Жлобінскім РВК. Тут з трох допісаў у пяяў насьці два, адзін прапаў бясьсьледна, лёс пяяўных допісаў сумны. Адзін допіс, у якім сыгналізуецца аб ігнараваньні пастаноў партыі і ўраду аб забясьпячэньні настаўнікаў работнікамі Райспажыўсаюзу, Страшынскім сельсаветам, сельспажыўтаварыствам і райспабам тав. Канігінам—гэты допіс праляжаў у РВК два тыдні, пасьля чаго на яго накладае рэзалюцыю старшыня РВК тав. Тамашэўскі: «тав. Куксу просьба даць тлумачэньне». А тав. Кукс (старшыня райспажыўсаюзу) зусім не зьвярнуў увагі на гэту рэзалюцыю, праверкі-ж выкананьня заданьняў не праводзіцца, і такім чынам ліст застаўся без усякага рэагаваньня.

Другі допіс трапіў у рукі сакратара РВК тав. Шыдлоўскага. У гэтым допісе рабочы вадатранспарту ўказваў на няправільныя дзеяньні Кабаноўскага сельсавету. Замест праверкі і рэагаваньня на гэты ліст тав. Шыдлоўскі пасылае яго старшыні гэтага-ж сельсавету для расьсьледваньня і паведамленьня вынікаў. Адным словам пасылае на расьсьледваньне таму, на каго пішацца скарга. Камэнтарыі да гэтага ня трэба. Тут мы маем самы агідны факт чыноўніцка-бяздушных адносін да рабочых лістоў.

У двух допісах, якія былі дасланы ў райза, калгасьнікі сыгналізуюць аб тым, што ў калгасе «Чырвоны баец», Папаратнянскага сельсавету, арудуюць клясавыя ворагі, якія пралезьлі на кіруючыя пасады калгасу і з дапамогаю работнікаў сельсавету выключылі з калгасу лепшага калгасьніка-бедняка, арганізатара калгасу тав. Цьвяткова. Выключылі за тое, што Цьвяткоў як на сходах, так і праз раённы і насьценны друк выкрываў кулацкую зграю, якая расьцягвала і раскрадвае зараз калгасную маемасьць.

У трэцім допісе за № 3997 калгасьнік выкрывае кулацкага абаронцу Журава А. Х., які, будучы сакратаром Малевіцкага сельсавету, прытуліў свайго сваяка кулака Крыцкага Івана, даў яму калгасны агарод і інш.

На ўсе гэтыя тры допісы кіраўнікі райза даюць у «Зьвязду» такі адказ: «На вашы заметкі № № 3297, 3397 і 3997 паведамляем, што Цьвяткоў дапушчан да работы, а далейшае высьвятленьне вядзе РКК РСІ». На гэтым пастаўлена кропка. Усе тры допісы па працягу каля двух месяцаў ляжаць у папках райза бяз руху.

Такі-ж малюнак і ў Жлобінскай пракуратуры, куды накіравана шэсьць допісаў. Ня гледзячы на рад папамінкаў, пракуратура маўчыць і па сёньняшні дзень. Аказалася, што і тут чатырох допісаў зусім няма і гэтую прапажу пракуратура тлумачыць тым, што «ўжо месяц як пракурор паехаў у армію і яго пошта не разьбіраецца, а таму магчыма, што гэтыя допісы ляжаць неразабраныя». Справа зусім ясная і ў Жлобінскай пракуратуры па-чыноўніцку, па-бюракратычнаму адносяцца да рабселькораўскіх лістоў.

Ня лепш справа з адказамі на «праверэныя» лісты. На ліст асьветніка, у якім падаюцца факты дрэннага абслугоўваньня ашчадкасай № 94 рабочых, заг. бюро скарг РКК РСІ тав. Хадоскін даў наступны адказ:

«Такога нумару ашчадкасы, якая ўказана ў заметцы, у Жлобіне няма, гэтая ашчадкаса знаходзіцца ў Гомелі».

А што-ж аказалася на справе? Аказалася, што каса № 94 тут-жа недалёка ад РКК РСІ і сапраўды працуе вельмі дрэнна.

Пры праверцы работы ашчадкасы пры Жлобінскай пошце ўстаноўлена, што аўтар допісу бясспрэчна праўдзіва. Работнікі гэтай касы сапраўды бязьдзейнічаюць, ня выплачваюць выйгрышаў, робяць розныя злачынствы. Загадчыца гэтай касы камсамолка Пімяноўская ўвесь час ігнаравала работу ашчадкасы, не хацела працаваць, давяла справу да таго, што другі квартал даў 7 тыс. рублёў адліву па ўкладах.

У Жлобінскай РКК РСІ ёсьць і такія факты, што са скрынкі бюро скарг ня вымаліся да апошніх дзён матар'ялы із скаргі рабочых, пачынаючы з канца 1932 г. У РВК-ж ляжыць больш чым 300 неразгледжаных заяў і скарг рабочых і калгасьнікаў.

Зусім зразумела, што «такія абураючыя, па сутнасьці антыпартыйныя адносіны да лістоў рабселькораў зьяўляюцца грубейшым парушэньнем пастановы ЦКК ад 13 верасьня 1932 г. па гэтым пытаньні. Гэта магло здарыцца таму, што кіруючыя раённыя арганізацыі большасьці раёнаў, а РКК у першую чаргу нячула, не па-бальшавіцку аднесьліся да сыгналаў працоўных мас, што аб'ектыўна зьяўляецца заціскам самакрытыкі, і па сутнасьці прыкрываюць шкодныя дзеяньні клясава-варожых элемэнтаў» (пастанова ЦКК КП(б)Б ад 4 мая 1933 г.).

Паданыя абураючыя факты адносін да лістоў і скаргаў працоўных Жлобіншчыны павінны паслужыць сыгналам для ўсіх раёнаў, яны паказваюць, як нельга працаваць. РК КП(б)Б павінны неадкладна праверыць, як рэагуюць асобныя арганізацыі і ўстановы на лісты, скаргі рабочых і сялян з тым, каб на хаду зьнішчыць існуючыя прарывы, узяцца па-бальшавіцку за хуткае і чулае рэагаваньне на рабселькораўскія лісты і скаргі працоўных.

Трэба спадзявацца, што ЦКК КП(б)Б і НК РСІ прымуць адпаведныя меры, пакладуць канец гэтаму агіднейшаму ігнараваньню лістоў працоўных, пакладуць канец чыноўніцкім адносінам да справы, што грае толькі на руку кулакам.

А. Мароз.

Кулакі разбураюць калгас

Калгасьнік тав. Пухаўскі паведамляе, што ў калгасе «1-га Мая», Макараўскага сельсавету (Горацкі раён) засела шайка кулакоў, ды ня толькі ў якасьці радавых калгасьнікаў, а нават на кіруючыя пасады.

Узначальвае ўсю кулацкую сьвіту Арлоўскі Герасім. Ён пры царыцкім служыў стражнікам. Да калгасу меў 11 дзесяцін сваёй уласнай зямлі і 7 арандаваў. Як да рэвалюцыі, так і пасьля на працягу доўгіх гадоў трымаў батракоў. Перад уступленьнем у калгас (1931 г.) аднаго каня прадаў за 500 рублёў, сельгасмашыны і другога каня аддаў сваёй дачцы. Апошняя-ж як сваю, так і ўзятую ў бацькі маемасьць разбазарыла і пралезла ў калгас пад такім-жа выглядам «бедняка», як і бацька.

Кулака Арлоўскага акружаюць: Новікаў Восіп, які меў 14 га зямлі і цьвёрдае заданьне, Новікава Прося, меўшая цьвёрдае заданьне, 8 га агародняй зямлі і каля двух га саду, Жукоўскі Давід і Пазел—цьвёрдазаданьнікі, мелі да калгасу на 12 га сваёй зямлі і па7 га арандавалі, мелі па трое коняй, але пры ўступленьні ў калгас разбазарылі іх. Старшынёй калгасу зьяўляецца Пухаўскі Аніс'м. Да калгасу ён меў цьвёрдае заданьне і пядзіва, што ён з усёй кулацкай шайкаю за адно.

Уся гэта зграя кулачча, а калі іх згрупаваны яшчэ рад і падкулачнікаў, каб было лягчэй разбураць калгас, пачала наступ на беднату і дабілася вылучэньня з калгасу Пухоўскіх Аўтуха і Ўльляна. Але аб'яднанае бюро скарг НК-РСІ СССР, азнаёміўшыся праз свайго прадстаўніка, які выяжджаў на месца, выключэньне Пухоўскіх адмяніла. У сваім рашэньні АБС прапанавала райКК-РСІ ачысьціць калгас «1-га Мая» ад кулацкіх элемэнтаў і ўмацаваць яго моцным партыйным кіраўніцтвам. Але-ж ня гледзячы на гэта кулакі па-ранейшаму з пад ціпка падрываюць карэнні калгаснай гаспадаркі, «ціхай сапай» на кіруючых пасадах твораць свае кулацкія справы. Дакуль-жа будзе Горацкая РКК-РСІ цацкацца з клясавымі ворагамі?

К.

Па сьлядох ненадрукаваных лістоў

Тав. Палітыка ў сваім лісьце ўскрыў агідныя факты бязгаспадарчасьці і раскрадваньня калгаснай маемасьці ў калгасе «Новае Сяло», Ульлянскага сельсавету, Сеньненскага раёну.

Сеньненская РКК-РСІ паведамляе, што ўсе факты пацьвердзіліся. Праўленьне калгасу распушчана і аддана пад суд. Суд разгледзеў справу і вынаватыя Шлыко Сямён (старшыня калгасу), Дзягель Іван (кладаўшчык) і Фуніс асуджаны ад 5 да 7 год.

***

Слуцкая РКК-РСІ паведамляе, што факты, указаныя ў допісе «Ачысьціць калгас «Колас» ад кулакоў і ладзеяў», адпавядаюць сапраўднасьці.

За дрэннае кіраўніцтва калгасам, за сувязь з клясава-чужымі элемэнтамі сакратар Бокшыцкай парт'ячэйкі Шукалоў зьнят з работы і выключан з партыі, старшыня с.-с. Шарамэт зьнят з работы і прыцягнут да партадказнасьці, Басалыга Іван, як клясава-варожы элемэнт, выключан з калгасу «Колас».

Х. Дунец

ЗМАГАЦЦА ЗА САВЕЦКІ РЭПЭРТУАР

Гэтымі днямі закончыўся пленум саюзу работнікаў мастацтва, на якім абгаварваўся даклад на тэму «Аб становішчы і задачах тэатральнага фронту». Паралельна з названым пленумам адбылася нарада дырэктароў і мастакіх кіраўнікоў тэатраў па пытаньнях вытворчага пляну тэатраў БССР. Мы тут падзелімся найбольш характэрнымі момантамі, вынятымі на гэтых нарадах, у сувязі з пытаньнем рэпэртуару тэатраў.

З боку некаторых работнікаў тэатраў рабіліся заявы аб тым, што «парфэлі» пусты і што прычына тут чыста зьнешняя: вінаваты пісьменьнікі. Прышлося даць адпор такому «аб'ектыўнаму» тлумачэньню рэпэртуарнага голаду. Прышлося ўказаць на другое, а імешна: што тэатры паслабілі сваю сувязь і работу з пісьменьнікамі, што аслабілі ўвагу з іх боку да савецкай актуальнай п'есы. За прыкладамі далёка хадзіць ня прыходзіцца:

1. У партфэлі Яўрэйскага дзяржаўнага тэатру маюцца купленыя тэатрам 6 арыгінальных п'ес яўрэйскіх пісьменьнікаў. Гэтыя п'есы ляжаць ужо даволі доўгі час мёртвым грузам. Жыве тым тэатр за апошні год ня даў ні аднай п'есы на тэму аб сацыялістычным будаўніцтве. Становішча такое, што п'есы ёсьць, але няма дастатковай мабілізацыі, каб над імі працаваць. Між тым Яўрэйскі дзяржаўны тэатр настолькі захапіўся за апошні перыяд клясыкай, што ў яго тры п'есы падрад трактуюць праблемы мінулых стагодзьдзяў; ці не атрымлівецца адход ад жыцьця сацыялістычнай краіны пры такім захапленьні клясыкай?

2. 2-гі Беларускі дзяржаўны тэатр прыняў п'есу народнага паэты Коласа «Вайна да пераможнага канца», але гэта п'еса ня была пастаўлена. Яна ляжыць у партфэлі тэатру і ня рухаецца з месца.

3. Першы Бездзяржтэатр палажыў пачатак работы з пісьменьнікамі над п'есамі, але і тут няма дастатковых мер да прыцягненьня пісьменьнікаў на хутчэйшае ажыцьцяўленьне іх плянаў работы.

4. Астатнія тэатры ніякай, ці амаль ніякай сувязі ня маюць з савецкімі пісьменьнікамі і ня дзіўна, што ў іх ня толькі пуста ў партфэлях, але нават адсутнічае тэматычны плян (БДТ-3, ЦДТ, ТЮГ). Характэрным зьявіцца становішча з Польскім дзяржаўным тэатрам. Гэты тэатр да вытворчай нарады прышоў бяз усякага матар'ялу. Разам з гэтым у «актыве» тэатру за апошнія месяцы маецца шкодная пастаноўка п'есы Запольскай «Мараль пані Дульскай», зьнятай са сцэны спэцыяльнай пастановай калегіі НКА за яе шкодную, мяшчанскую, раз лагаючую ўзьдзейнасьць на гледача. Здавалася-б, што гэты ўрок павінен быў-бы даць штуршок для падшуканьня падыходзячага рэпэртуару. Але апартуністычнае кіраўніцтва тэатру (дырэктар Багінскі) і ў вус сабе ня дамне. Наадварот, пасьля пастановы калегіі НКА аб забароне «Маралі пані Дульскай» работнікі тэатру падаюць матар'ял у раённым друку, разьлямовучы «Мараль пані Дульскай», як пастаноўку, узрываючую быт фашысцкай Польшчы... Да такой ніяка-пробнай фальшы могуць спусьціцца толькі гаўляры ад тэатральнай справы, а не савецкія работнікі мастацтва.

Кіраўнікі польскага дзяржаўнага тэатру хочуць трыкрыць сваю нагату фальшыва-нацыянальным сьцягам: Мы, гавораць яны, паставілі рэч Запольскай таму, што гэта «польская нацыянальная клясыка». Але ці можна Запольскую далучыць да клясыкаў? Ніякага сумненьня ня можа быць, што п'еса «Мараль пані Дульскай» ніякіх адносін да клясыкі ня мае і што, па-другое, прыкрыць абываталыцчыну сьцягам «нацыянальнай клясыкі» нікому ня будзе дазволена.

Між тым на спэцыяльнай нарадзе аб рэпэртуары польскага дзяржаўнага тэатру пры сэктары мастацтва НКА выявілася, што рад польскіх савецкіх пісьменьнікаў працуюць над п'есамі актуальнай тэматыкі і патрабуецца толькі штуршок, дапамога і г. д., каб атрымаць рэальныя вынікі ад гэтай работы.

Такім чынам, рад фактаў гаворыць аб тым, што большая доля віны за адсутнасьць рэпэртуару падае на тэатры, якія пусьціліся на самацёк і ў радзе выпадкаў найшлі па лініі найменшага супраціўленьня. З гэтым трэба пакончыць. Маючы ў сябе толькі адну клясыку, як-бы добра яна ня была (а яна, клясыка, вельмі часта дрэнна выглядае на нашай сцэне) наш тэатр ня можа быць савецкім тэатрам без асноўнага рэпэртуару, адпавядаючага сацыялістычнае будаўніцтва.

Хіба мы можам мірыцца з такім становішчам, калі Дзяржтэатр оперы і балету праектуе плян на пару год уперад толькі з клясычных опэр? Мы ведаем, што гэты тэатр і яго кіруючыя работнікі ўмеюць адбіраць лепшае ў клясычным рэпэртуары, але не аднаёй клясыкай жыве савецкая опэра. Прышл

ДА САВЕЦКА-ПЭРСЫДЗКІХ ГАНДЛЁВЫХ АДНОСІН

ТЭГЕРАН, 4 (Белта). Уласны карэспандэнт «Правды» паведамляе, што 3-га жніўня адбыўся шматлікі сход тэгеранскага купецтва, на якім быў канстатаван правал байкоту савецкіх тавараў, і было аднагалосна пастаўлена аднавіць гандлёвыя апэрацыі з савецкімі арганізацыямі. Правінцыяльнаму купецтву паслана за подпісам асацыяцыі тэгеранскага купецтва дырэктыўная тэлеграма, у якой гаворыцца: «У сувязі з указаньнямі пэрсыдзкага ўраду, а таксама ў сувязі з яго заявамі, што ў далейшым канфлікты будуць ліквідаваны, асацыяцыя пастанавіла ПАЧАЦЬ АПЭРАЦЫІ З САВЕЦКІМІ ГАСПАДАРЧЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ І АДНАВІЦЬ ГАНДАЛЬ». Згодна паведамленьня друку, перад гэтым рашэньнем адбыліся перагаворы купецтва з міністрам заможных спраў ФОРУГІ.

Сусьветны эканамічны крызіс выклікаў рэзкае пагаршэньне зьнешнягандлёвага балянсу Парсіі. Створанае становішча цяжка адбілася на становішчы пэрсыдзкага купецтва. Гэтую акалічнасьць скарысталі некаторыя антысавецкія колы для кампаніі супроць пэрсыдзка-савецкага гандлю.

Кампанія выявілася пераважна ў выступленьнях супроць савецкіх гаспадарчых арганізацый у Пэрсыі і супроць існуючага савецка-пэрсыдзкага гандлёвага дагавору. У пачатку лютага 1933 г. Тэгеранская гандлёвая палата прыняла пастанову, якая прапанавала ўсім купцом «ўстрымоўвацца ад індывідуальных апэрацый з савецкімі арганізацыямі аж да ўстанаўленьня канцэнтрацыі савецка-пэрсыдзкага гандлю, згодна даных пэрсыдзкім урадам абяцаньняў». Аднак, абвешчаны байкот савецкім таварам канёс толькі дапейшую шкоду пэрсыдзкаму купецтву. Гэтая акалічнасьць і паслужыла прычынай ліквідацыі байкоту.

Падпісаньне згоды паміж Польшчаю і Данцыгскім урадам

ВАРШАВА, 7 (Белта). Падпісаны дзьве згоды паміж Польшчай і Данцыгскім урадам. Адна рэгулюе пытаньне аб правах польскіх грамадзян на тэрыторыі Данцыгу ў адносінах навучаньня дзяцей у дзяржаўных і прыватных пачатковых і сярэдніх школах. Згода ўстанаўляе парадак карыстаньня польскаю моваю ў данцыгскіх установах. Другая згода датычыць, галоўным чынам, скарыстаньня данцыгскага порту Польшчай. На падставе гэтай згоды мяркуецца пачаць спэцыяльныя перагаворы.

Суд над супрасьльскімі тэкстыльшчыкамі

ВАРШАВА, 7. (Уласная інфармацыя «Зьвязды»). Як паведамляе «РОБОТНІК», пракуратура беластоцкага акруговага суда скончыла сьледзтва па справе крывавых выпадкаў у СУПРАСЬЛІ (каля Беластоку), якія там здарыліся ў часе забастоўкі тэкстыльшчыкаў. 14 арыштаваных рабочых абвінавачваюцца ў «актыўным супраціўленьні паліцыі».

Забастовачны рух у краінах капіталу

КУБА. Як паведамляюць з ГАВАНЫ, забастовачны рух на КУБЕ ахапіў усю краіну. Па думцы друку гэты рух мае мэту зьвяржэньня дыктатара МАЧАЛО.

У заходняй частцы востраву ў рэзультаце забастоўкі чыгуначнікаў паралізован транспарт. Шмат работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў, у тым ліку пошты і тэлеграфу далучыліся да руху. Паштова-тэлеграфныя зносіны прыпынены. Па ўсёй краіне газэты на выходзяць. У ГАВАНЕ паліцыя і войскі ня раз атакоўвалі сходы і дэманстрацыі бастуючых. Шмат рабочых забіта. Сотні забастовачных актывістаў арыштаваны.

ДАНІЯ. У дацкім порце ня спыняюцца дэманстрацыі пратэсту грузчыкаў супроць германскіх параходаў, якія ўзьнялі нацыянал-сацыялістыцкія сьцягі. Выступіў камдэпутат дацкага парляманту МУДХ-ПЭТЭРСЭН. Пасьля дэманстрацыі рабочыя прараваліся праз паліцэйскі кардон у порт і прымусілі штрэйк брэхэраў выйсьці з германскіх параходаў. Не разгружана ¾ усіх прыбыўшых германскіх грузаў. Друк бачыць у гэтай забастоўцы вялікую перамогу камуністаў. Рэфармісцкія прафсаюзныя лідэры ўсімі спосабамі перашкаджаюць дэманстрацыям.

ПАЗШ. У ЮНІЁНТАЎНЕ (штат Пэнсыльванія) адбылася канфэрэнцыя прад стаўнікоў бастуючых гарняковых Пітсбургскага раёну. Пераважнаю большасьцю адхілена прапанова лідэраў аб'яднанага саюзу гарняковых адновіць работу з 7-га жніўня ў адпаведнасьці са згодаю паміж урадам і прафбюракратамі.

БАЛГАРЫЯ. У сувязі з выступленьнямі рабочых першага жніўня па ўсёй Балгарыі праведзены масавыя арышты. У Сафіі арыштаваны ўсе члены кіраўніцтва незалежных прафсаюзаў, а таксама рэдактар «АНТЫФАШЫСЦКАГА ФРОНТУ».

Усепольскі зьезд былых легіянэраў

ВАРШАВА, 7. (БЕЛТА). Адкрыўся Усепольскі зьезд былых легіянэраў, на якім, згодна паведамленьня ПАТ, прымае ўдзел 20 тысяч чалавек. Лідэр урадавага блёку, былы прэм'ер СЛАВЭК зрабіў паведамленьне аб распрацаваным блёкам праекце рэформы канстытуцыі. Славэк падкрэсліў, што новы праект — працяг рэформы канстытуцыі, праробленай пасьля прыходу да ўлады Піпсудзкага ў 1926 г. Уся ўлада павінна быць сканцэнтравана ў будучым у руках прэзыдэнта, на якога ўскладаецца абавязак каардынаваць дзейнасьць усіх органаў улады. Сэнат, па прапанове Славэка, павінен складацца наступным чынам: дзьве трэціх сэнатараў павінны выбірацца кавалерамі ардэноў «ваеннай доблесьці» і «крыжа незалежнасьці». Трэць сэнатараў павінна прызначацца пэрсанальна прэзыдэнтам.

Па шпальтах замежнага друку

Аб чым гавораць лічбы

Віцэ-міністар вайсковых спраў Польшчы генэрал Славой-Складкоўскі ў сваёй прамове аб крызісе і будучыні польскай дзяржавы, якую ён выгласіў на XII зьездзе легіяністаў, як толькі мог абмінаў лічбы. Бо і як тут іх прыводзіць, калі хочацца даказаць, што крызіс у Польшчы гэта зусім ня крызіс! Але ў той самы час, як пан віцэ-міністар стараўся даказаць, што крызіс гэта ня крызіс, упартыя лічбы, надрукаваныя ў польскіх газэтах, гаварылі нешта зусім іншае. Лічбы сьцьвярджалі, што ў Польшчы паглыбляюцца самы сапраўдны эканамічны крызіс, што паступленьні простых падаткаў у чэрвені месяцы зьменшыліся ў параўнаньні з меем на 8,7 мільёнаў злотых, што даходы з мытных збораў за той самы час зьменшыліся на 2,7 мільёнаў злотых і што запалкавая манаполія зусім нічога не ўплаціла ў дзяржаўны скарб у чэрвені месяцы. Наступ, як паказваюць гэтыя лічбы, за першы квартал 1933-34 бюджэтнага году наступленьні в падаткаў і манапоній складаюць суму толькі ў 375,7 мільёнаў злотых, г. зн. на 43,7 мільёнаў менш, чым прадбачыць дзяржаўны бюджэт і на 29 мільёнаў менш за той-жа самы час мінулага году.

Упартыя, непаслухмяныя лічбы!

Ціхаакіянскія сустрэчы

Мал. Вал. Мядзьведзева.

Англія ўстрывожана японска-амэрыканскай барацьбой за панаваньне на Ціхім акіяне. Ангельскія ваенна-морскія колы вельмі абураны ўзьнікшай зараз пэрспэктывай, необмежванага спаборніцтва паміж Амэрыкай і Японіяй на Ціхім акіяне.



Англа-французскі пратэст супроць германскай прапаганды ў Аўстрыі

БЭРЛІН, 7. (Белта). Агенцтва «Вольф» паведамляе, што французкі пасол у Бэрліне зрабіў сёньня прадстаўленьне ў міністэрстве замежных спраў, у якім, спасылаючыся на пакт 4-х, указаў, што, на думку французкага ўраду, германская прапаганда ў Аўстрыі нясумяшчальна з дагаворнымі абавязацельствамі. Адказ, даны французкаму паслу, паводле слоў агенцтва, гаворыць, што германскі ўрад лічыць неўмеснай спасылку ў даным выпадку на пакт 4-х і што Германія ні ў якай форме не парушыла дагавору, і таму Германія лічыць умяшаньне ў аўстра-германскі канфлікт недапушчальным. Учора ўвечары ангельскі паверанны ў справах у Бэрліне зрабіў у міністэрстве замежных спраў аналёгічнае прадстаўленьне.

Водгукі германскага друку на англа-французкі пратэст

БЭРЛІН, 7. (Белта). У сувязі з выступленьнем Францыі і Англіі, германскі друк канцэнтруе ўсю сілу сваіх нападак на ўрадзе ДОЛЬФУСА, а таксама на ФРАНЦЫІ, АНГЛІІ І МАЛАЙ АНТАНЦЕ, абвінавачваючы іх у тым, што далі згоду на стварэньне аўстрыйскай дапаможнай паліцыі ў 18 тысяч чалавек. Афіцыёз германскага міністэрства замежных спраў «ДЭЙЧЭ ДЫПЛЁМАТЫШЭ КАРЭСПАНДЭНЦ» абураецца тым, што Францыя, Англія і Малая Антанта ў той-жа час разглядаюць усе германскія саюзы, як арганізацыі ваеннага характару. Паводле слоў афіцыёзу, «санкцыя на фактычнае падваеньне аўстрыйскіх ваенных сіл супярэчыць духу і літары мірных дагавораў».

Афіцыёз рэзка падкрэсьлівае, што дазваляючы павялічэньне аўстрыйскіх войск, «гэтыя-ж дзяржавы імкнуцца сабатаваць абвешчанае згодаю ад 11-га сьнежня 1932 году раўнапраўе Германіі ва ўзбраеньнях». Гэты акт (згода на стварэньне дапаможнай паліцыі) Аўстрыі, паколькі ён зроблен бяз згоды Італіі і Германіі, супярэчыць, паводле слоў афіцыёзу, пакту 4-х.

Тав. Анры Барбюс на борце „АНТ-14"

МАСКВА, 8. (Белта). Вядомы французкі пісьменьнік і грамадзкі дзеяч тав. Анры Барбюс, які знаходзіцца зараз у Маскве, наведаў гэтымі днямі ў Маскоўскім аэрапорце агітэскадрыльлю імя М. Горкага і зрабіў палёт над Масквой на флагманцкім караблі агітэскадрыльлі «АНТ-14» імя «Праўды».

У кнізе запісаў агітэскадрыльлі тав. Анры Барбюс напісаў наступнае: «Я шчасьлівы тым, што маю магчымасьць пісаць аб сваіх уражаньнях на борце «Праўды». Карыстаюся гэтым, каб прынесьці мае шчырыя віншаваньні і выказаць захапленьне ўсім работнікам аэрадрому, інжынэрам, тэхнікам, камандзірам, пілётам, механікам і рабочым і па-брацку падзякаваць іх за іх прыём. Я магу канстатаваць выдатныя шрагрэс, дасягнуты савецкай авіяцыяй, і я шчасьлівы адзначыць, што самыя складаныя і самыя вялікія самалёты — савецкай вытворчасьці. Апрача таго, гэты бліскучы палёт над Маскоўскай дазволіў мне ўпэўніцца яшчэ ў наступным — у росьце Масквы, убачыць з вышыні птушынага палёту вялізарныя і шматлікія новыя пабудовы, якія множацца з году ў год, можна сказаць, з гадзіны на гадзіну. Няхай жыве авіяцыя СССР!

БАРБЮС».

Полацак выканаў плян дарбудаўніцтва

ЦК КП(б)Б—т. ГІКАЛО, старшыні СНК БССР—т. ГАЛАДЗЕДУ, рэдакцыі „Зьвязда", Галоўдартрансу БССР—т. Фрумкіну

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі нашага раёну, на аснове шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сельсаветамі, калгасамі і аднаасобнікамі, на 1-е жніўня плян дарожнага будаўніцтва і скарыстаньня працудзелу насельніцтва выканалі на 100,4 проц.

Значную дапамогу па мабілізацыі грамадзкай думкі вакол пытаньня дарбудаўніцтва аказала раённая газэта «Сталінец». Заданьне партыі і ўраду — даць краіне добрыя дарогі ў асноўным выканана. Чырвоныя абозы са збожжам дзяржаве пойдуць па адрамантаваных шляхох.

Змагаемся за далейшае паляпшэньне шляхоў. Работу праводзім далей.

Сакратар райкому КП(б)Б КАМЯНЕЦКІ.

Старшыня райвыканкому ШАХ.

Рэдактар газэты «Сталінец» ШЫЛЯНКОЎ.

Загадчык Дарадзделу ВАЛАХОВІЧ.

Асіпавіцкі і Капыльскі раёны зрываюць свячасовае сканчэньне будаўніцтва дарогі

Лічбы, якія характарызуюць ход работы па АДПР—4 на працягу апошніх дзён красамоўна сьведчаць аб тым, што вучастак коціцца ў глыбокі прарыў. Тэрмін сканчэньня работ па АДПР—4—1-га жніўня, а работы наперадзе яшчэ шмат.

Асноўнае, у што зараз упіраецца работа — гэта рабочая сіла. Трэба адзна чыць, што за апошні час работа па арганізацыі масавага выхаду на лінію пешай рабочай і цягавай сілы паспаб па. Вынікі гэтага ўжо адчуваюцца: на лініі вострыя недахват падвод, каменябойцаў, укладчыкаў пакеляжу.

Раёны апошнім часам абсалютна нічога ня робяць для таго, каб забясьпечыць дарогу рабочай сілай. Горш за ўсё абстаіць справа ў АСІПАВІЦКІМ і КАПЫЛЬСКІМ раёнах, кіраўніцтва якіх, адгарадзіўшыся ад жывой справы казённымі дэклярацыямі, фактычна зрывае справу сканчэньня дарогі ў тэрмін. Замест патрэбных штодзённа 2500 падвод і гэткае-ж колькасьці пешых, КАПЫЛЬСКІ раён даў ў дзень каля 300-350 падвод і 100-150 пешых. Асабліва адстае ў справе арганізацыі выхаду на дарогу рабочай сілы важнейшы Бабаўнянскі сельсавет.

У АСІПАВІЧАХ справы ня лепшыя. Надаваўшы ўрачыстых абяцаньняў «дабіцца пераломy», «забясьпечыць» і г. д., апартуністычнае кіраўніцтва гэтага раёну ня здолела на справе забясьпечыць выхад на лінію і паловы прадугледжанай плянам колькасьці рабочай сілы.

СЛУЦКІ раён, які, пасьля трывожных сыгналаў вызной рэдакцыі газэты «Зьвязда», сапраўды актыўна, сапраўды па-бальшавіцку ўключыўся ў месячнік штурму бездарожжа, але апошнім часам паспабіў сваю работу на гэтым важным вучастку сацыялістычнага будаўніцтва і гэтым самым станавіцца ў ганебны рад зрыўшчыкаў свячасовага сканчэньня пляну дарожных работ.

Інакш справа стаіць у Стара-Дароскім раёне. Старшыня Стара-Дароскага РВК тав. БАРСУКЕВІЧ і загадчык дарожнага аддзелу тав. ШКОДА, увесь час знаходзячыся на лініі дарожна-будаўнічых работ, выразнай апэрацыйнай работай, штодзённым бальшавіцкім кіраўніцтвам забясьпечваюць выхад пэўнай колькасьці рабочых на дарогу.

Патрэбна адзначыць яшчэ тое, што тэхнічны пэрсанал вучастку не заўсёды правільна выкарыстоўвае падводы і рабочых на лініі, не заўсёды правіль на расстаўляе рабочую сілу, што ў сваю чаргу прыводзіць да зьніжэньня прадукцыйнасьці і эфэктыўнасьці працы, а часам і проста да блытаніны, якая адмоўна ўплывае на выкананьне пляну, тармозіць справу свячасовага сканчэньня дарогі. Асабліва шмат блытаніны з расстаноўкай рабочай сілы, нерацыянальнае скарыстаньне яе назіраецца на вучастку праваба—4 — тав. МАРОЗА, дзе тэхнікі МАТРОСАЎ і ШЛЯХЦЕНКА сьвядома ўкосілі блытаніну ў справу скарыстаньня рабочых на лініі.

Што патрэбна зараз зрабіць для таго, каб забясьпечыць выкананьне пляну, каб вывесьці АДПР — 4 з прарыву і забясьпечыць уборку добрымі дарогамі?

Неадкладная арганізацыя масавага выхаду насельніцтва на дарогу, правільная расстаноўка цягавай і пешай рабочай сілы, забясьпячэньне максымальнай эфэктыўнасьці работы шляхам ушчыльненьня рабочага дня, суровая плянавасьць у рабоце.

Выязная рэдакцыя «Зьвязды»
А. ЛЕВІН, МІХ. БАГУН,
Т. КЛЯШТОРНЫ.

Саюзтранс па-ранейшаму зрывае адгрузку падручнікаў

Зводка выданьня стабільных падручнікаў на 8 жніўня 1933 г.

Павінна быць надрукавана 100 падручнікаў з агульным тыражом у 2.800 тыс. экз.

Выйшла з друку 56 падручнікаў (з іх беларускіх—39, яўрэйскіх—11, польскіх—4, літоўскіх—2) з агульным тыражом 1.970 тыс.

Здана ў друкарню 59 падручнікаў.
У НКА—5.
У ДВБ—3.
У аўтараў—3.

Усяго здан на базу 41 падручнік з тыражом 1.276.297 экз.

Усяго адгружана на рабн 86 падручнікаў з тыражом у 1.202.950. Саюзтрансам забрана за 7 жніўня 41.400. Засталося ўпакаваных 99.225 падручнікаў.

Кантрольная лічба штодзённага выпуску па друкарні імя Сталіна—40.000 Выпушчана за дзень 40.000.

Загадчык вучпадсэктару ДВБ М. ДУБРАВІЦКІ.

Недапушчальна марудныя тэмпы здачы тыражоў на базу з боку друкарні імя Сталіна. Саюзтранс па-ранейшаму марудзіць з адпраўкай падручнікаў на раёны. Замест 60.000 у дзень ён забірае 30-40 тысяч, ня больш. Гэта стабільная лічба. Прычыны? Работнікі Саюзтрансу проста не жадаюць за біраць падручнікі пасьля 2-х гадзін дня. Між тым, як патрэбна, каб Саюзтранс забіраў падручнікі на працягу усяго дня, і ня менш 60.000 у дзень. Калі Саюзтранс і ў далейшым будзе працягваць такую ганебную зацяжку адпраўкі падручнікаў—апошнія да пачатку навучальнага году ня будуць ад праўлены школам. Мы яшчэ раз пытаемся ў парт'ячэйкі Саюзтрансу чаму яна дагэтуль стаіць у баку ад такой важнейшай справы, як выкананьне дырэктывы ЦК партыі аб свячасовым забясьпячэньні школ стабільнымі падручнікамі?

Па БССР

ВЫЦЕРАБЛЕНА 1.199 ГЭКТАРАЎ ІЛЬНУ

Ільнаводчыя МТС прыступілі да масавага ільнаперабленьня. Да 6 жніўня па МТС Белільнатрактарацэнтру выцераблена 1.199 гэктараў ільну—2 проц. заданьня.

Найбольшыя паказальнікі даюць: Дрысенская МТС, якая выцерабіла 129 гэктараў ільну—5,2 проц., Талачынская—6,3 проц. і Лёзьнянская —5 проц.

Абчосан і абмалочан ураджай ільну са 165 гэктараў, а замочан са 148.

Самалёт „Сьцяг індустрыялізацыі"

На сродкі рабочых віцебскай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» пабудаван самалёт, які названа імем фабрыкі. 18-га жніўня рабочыя фабрыкі перадаюць гэты самалёт беларускай авіяшколе.

З 12 па 24 жніўня ў аднаку для авіяцыі віцебская авіяшкола арганізуе агітаблёты з-х раёнаў Беларусі: Гарадоцкага, Полацкага і Бешанковіцкага, у часе якіх будуць праведзены гутаркі з калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі аб правядзеньні ўборкі і дасрэміновай здачы збожжа дзяржаве.

Апрача гэтага Віцебскай авіяшкола намечана ў часе палётаў арганізаваць катаньне на самалётах лепшых ударнікаў сацыялістычных палёў, якія атрымалі першыя кніжкі па здачы збожжа дзяржаве.

Культурная сувязь БАН з Бразіліяй

Акадэмія навук БССР атрымала ліст ад дырэкцыі нацыянальнага архіву бразільскай рэспублікі. У гэтым лісьце паведамляецца, што ў мэтах наладжаньня культурнай сувязі з Беларускай Акадэміяй Навук, нацыянальны архіў Бразіліі высылаў на адрас Акадэміі вельмі каштоўны лістарычны матар'ял сакрэтнага характару, які адносіцца да дыпляматычных падзей у С. Пецярбурзе ў перыяд 1843-45 г. г.

Гэты матар'ял у свой час быў падобран і запісан адным з дыпляматаў Бразіліі — Іоэ-Мар'я-Дэ-Аморэнь.

Прэзыдыум БАН задаволіў просьбу дырэкцыі нацыянальнага архіву бразільскай рэспублікі аб систематычным высылцы яму матар'ялаў, якія датычаць гісторыі разьвіцьця Беларусі.

Фізкультура і спорт

ЭСТАФЭТА ІМЯ СТАРШЫНІ ВСФКБ ТАВ. ЗАКОЎСКАГА

1-га жніўня пачалася месячная агульна-гарадзкая фізкультурная эстафета імя тав. Закоўскага з удзелам 33.000 чалавек фізкультурнікаў. Усяго эстафэтай павінна быць ахоплена 50.000 фізкультурнікаў.

Галоўная мэта эстафэты — агляд фізкультурнай работы і 100 проц. здача норм на значок «ГПА». Эстафэта разьбіта на тры этапы: першы этап—з 1-га па 10 жніўня, арганізаванае здача нормы на плаваньні і граблі; другі этап—з 10 па 20 жніўня, здача норм па лёгкай атлетыцы разам з усімі відамі воднага спорту. За гэты час павінна быць пачатковую выканана кантрольная лічба (21.000 чал.) здачы норм па ўсіх відах спорту; трэці этап пачынаецца з 20 жніўня да 1-га верасьня, у часе якога арганізуюцца ўнутры-заводзкія спартакіяды па лёгкай атлетыцы і аднаначасова падводзяцца вынікі эстафэты.

Фізкультурныя калектывы, якія дадуць лепшыя паказальнікі ў выкананьні лічбаў на здачы норм, атрымаюць прэмію.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ КІРАЎНІЦТВА ДАМЭЦ гор. Масква
Гарадзкі сад Дзяржцырк —ПАШТО.
Сёньня і штодзенна вялікая праграма. Выступаюць артысты ГУГЛІЕЛЬМОНІ—музычны камбінацыйны акт. Вясёлыя начагары—матроскія танцы. Гастролі папулярнага артыста Леаніда Іванова—група дрэсіраваных сабак, малпаў, варблюдаў, поні і германскі втрацыён Пэўльтон і Далей—вынаходцы-вэлісыпэдысты. Чужаземная стайна Пейзэр-Барум—новая дрэсіроўка і шмат іншых нумароў.
ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.
УВАГА: гэтымі днямі гастролі чалавекаваздобнай малпы.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня. Замежны фільм АПОШНІ РАМІЗЬНІК БЭРЛІНУ Драма ў 7 частка х.

„ПРАЛЕТАРЫ" Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. веч. Мастацкі замежны фільм САЛАМБО

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Мастацкі фільм ПАЭТ і ЦАР

ДЗІЦЯЧЫ ГУЛЯЎБЫ кіно-тэатр 3-я СЭРЫЯ Чырвоныя д'ябаляты („СЫНУР МАГІЛА")

„СПАРТАК" Каса—з 3 г. 30 м. Замежны фільм НІНІШ кіно-раман у 8 частках

Завочны сэктар Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытуту АБВЯШЧАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ на наступныя аддзяленьні:
—хіміка, біялёгічнае і фізыка-матэматычнае. Заявы з адпаведнымі дакументамі прымаюцца да 1 верасьня на адрасе: Гомель, Пралетарская, 2.
Дырэкцыя.

ЖЛОБІНСКАЯ ШКОЛА ФЗВ САЮЗПТУШКАПРАДУКТУ АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР ВУЧНЯЎ.
Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодкі, ШКМ ці іншыя навучальныя ўстановы ім адпавядаючыя. Усе іншыя павінны трымаць іспыты за курс сямігодкі. Прынятыя ў школу забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй ад 33 да 63 руб. у месяц у залежнасьці ад пасьпяховасьці і тэрміну навучаньня. Таксама забясьпечваюцца харчаваньнем, спэцабзяньнем праз каапэрацыю наровіі з рабочымі прадпрыемствамі. Да заяў патрэбна прыкласьці дакументы: аб асьвеце, мэтрычную справку, аб сацыяльным становішчы, паступаючага і яго бацькоў, аб стане здароўя і засьведчаную анкету.
Заявы прымаюцца да 25 жніўня на адрасе: г. Жлобін, Пітушкамбінат, школа ФЗВ.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ
ДЗЯЎЧЫНА З ДЖУНГЛЯЙ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТАРФЯНЫ ТЭХНІКУМ АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
студэнтаў на першы курс вытворчага аддзяленьня.
Да заявы павінны быць прыкладзены дакументы згодна палажэньня аб прыёме ў тэхнікумы.
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай.
Прыём заяў да 15 жніўня на адрасе: Менск, Чырвонаармейская, 16, торфтэхнікум.
Аб пачатку іспытаў будзе паведамлена дадаткова.
Дырэкцыя.

Жыліцкая школа саўгассыравіны АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
вучняў у складзе 80 асоб на адзін сезон гародніне і жывёлагадоўлі—корма здабываньня. Прымаюцца дзеці рабочых, калгасьнікаў і бедняко-аднаасобнікаў ад 14 да 17 гадоў, якія скончылі 4—5 груп сямігодкі. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай. Для паступленьня неабходны наступныя дакументы: пасьведчаньне аб асьвеце, аб сацыяльным становішчы, мэтрычная справка, аб здароўі.
Заявы прымаюцца да 23 жніўня. Адрас п.-а Жылічы, Бабруйскага раёну.

Віцебскі вучэбны камбінат спажывецкай каапэрацыі АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР
У КААПЭРАЦЫЙНЫ ТЭХНІКУМ
на першы курс на наступныя аддзяленьні: а) плянава-эканамічнае дзеннае; б) плянава-эканамічнае вечарняе, без адрыву ад вытворчасьці; в) эканамістаў па працы; г) гандлёвае.
УМОВЫ прыёму, згодна даведніка НКА для паступаючых у тэхнікумы.
Пры паступленьні неабходна трымаць іспыты ў аб'ёме сямігодкі па беларускай мове, матэматыцы, хэміі, фізыцы і гармадазнаўстве.
Тэрмін падачы дакументаў да 15-га жніўня. За ўсімі даведкамі звяртацца па адрасе: гор. Віцебск, Валадарская, 29.
Прынятыя ў тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй.
Дырэкцыя.

Высачанскі дашкольны тэхнікум абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР
студэнтаў, на першы курс—150 чал.
Прыём заяў да 20 жніўня. Да заявы неабходна прадставіць заверэную анкету, пасьведчаньне аб адукацыі, даведку аб сацстановішчы, аб стане здароўя, мэтрычны выпіс і 2 фотакарткі. Заявы без дакументаў не разглядаюцца. Пасту паючыя падлягаюць іспытам па матэматыцы, фізыцы, хэміі, беларускай мове і грамадазнаўстве за 7 груп сямігодкі. Іспыты—з 25 жніўня па 1 верасьня. Курс навучаньня—3 гады. Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмерах 45—50 руб., інтэрнатам і сталовай.
Адрас: ст. Крынкі, МБВ, п.-а. Высачаны, Лёзьнянскага раёну, дашкольны тэхнікум.
Дырэкцыя.

Горацкі дзенны рабочы факультэт імя Галадзеда АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
на 1, 2 і 3-ці КУРСЫ дзеннага рабфаку.
УСЕ студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй (45—55 р.)
Прыём заяў па 26-е жніўня. Іспыты з 25-е жніўня па 1-е верасьня. Пачатак заняткаў з 1 верасьня 1933 году. Адначасова праводзіцца прыём студэнтаў на вячэрні рабфак без адрыву ад вытворчасьці на 1, 2 і IV курсы. Да заяў не абходна далучыць дакументы (ў арыгіналах) згодна даведніка НКА сьветы для паступаючых у рабфак, і паштовых марак на 40 кап. Т. т. ніяк прыедуць на іспыты павінны захаваць з сабою свае рэчы, бялізну і пасьцельныя прылады, бо ў выпадку адмаўленьня зарахаваць прыступаюць да заняткаў. Заявы накіроўваць па адрасу: г. Горкі, БССР, рабфак імя Галадзеда.
Дырэкцыя.

ВІЦЕБСКІ МЭХАНІКА-ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ПАЛІТЭХНІКУМ АБВЯШЧАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ
без адрыву ад вытворчасьці на механічную і канструктарскую групы ў колькасьці 50 асоб і з адрывам ад вытворчасьці на групы: механіка, электрыка і цёплатэхніка ў колькасьці 100 асоб. Прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме сямігодкі. Іспыты будуць праводзіцца з 15 па 20 жніўня па гармадазнаўству, матэматыцы, фізыцы, хэміі, родная мова і прыродазнаўству. Да заявы неабходна прыкласьці наступныя дакументы: засьведчаную анкету, мэтрычную выпіс, аб адукацыі, аб сацыяльным паходжаньні, аб сілы—даведку аб суме падатку ў 1932 г., аб стане здароўя, дзьве фотакарткі, аб праве голасу і нарэшце на 40 кап. для адказу. Набор прыцягваецца да 15 жніўня 1933 г.
Залічаныя забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам, сталоўкай на агульных падставах.
Дырэкцыя.

Даводзіцца да ведама ўсіх гандлёвых (нупляючых тавары) арганізацый, што
беларускай канторай ДЗЯРЖБАНКУ ПРАДАЕЦЦА:
вата II-га гатунку на суму 21.280 руб. 65 кап., належачая швэйнай фабрыцы „НАСТРЫЧНІК" за адмаўленьне ад акцэптаў.
Зварачацца да тав. ГРАНАТА.

МАРЫНА-ГОРСКІ САДОВА-ГАРОДНЫ ТЭХНІКУМ,
які рыхтуе аграномаў сярэдняй кваліфікацыі, абвяшчае ДАДАТКОВЫ НАБОР студэнтаў на вячэрняе аддзяленьне без адрыву ад вытворчасьці. Адначасова працягваецца набор на плановае і гароднае (дзеннае) аддзяленьні.
Заявы з адпаведнымі дакументамі прымаюцца да 25-га жніўня.
Пачатак заняткаў 1-га верасьня 1933 г.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй па пасьпяховасьці і сталоўкай (кошт сутачнага харчаваньня—сьніданьне, абед і вячэра—85 кап.).
Адрас: Марына-Горка, садова-гародны тэхнікум.
Дырэкцыя.

Інстытут аграглебазнаўства і ўгнаеньня Беларускай Акадэміі Навук АБВЯШЧАЕ НАБОР АСЬПІРАНТАЎ
са скончыўшых ВНУ.
Тэрмін падрыхтоўкі—3 гады па наступным профілях: хэмія глеб, агра-фізыка глеб, агра-біялёгія, агра-глебазнаўства і хэмізацыя сельскай гаспадаркі. Падача заяў да 1 верасьня. Пра ўмовы прыёму гл. газэту «Зьвязда» ад 13 красавіка г.г.
Заявы прымаюцца:
Менск, Широкая, 28. Інстытут аграглебазнаўства і ўгнаеньня.
Дырэкцыя.

ВІЦЕБСКІ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ТЭХНІКУМ абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР
студэнтаў з адрывам і без адрыву ад вытворчасьці. Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі для фінансавай сыстэмы і спэцбанкаў. Залічаныя студэнты ў першым сымэстры атрымліваюць дапамогу, у другім сымэстры атрымліваюць стыпэндыю ў залежнасьці ад пасьпяховасьці і забясьпечваюцца інтэрнатам. Заявы з дакументамі (арыгіналамі) накіроўваць па адрасе: Віцебск, 1-ая Валадарская вул., дом № 29, 2-гі паверх, фінтэхнікуму. Прыём заяў да 15-га жніўня 1933 году.
Іспыты для ўсіх паступаючых з 25-га жніўня па 1-ае верасьня 1933 г.
Дырэкцыя.

Менскі Беларускі дзяржаўны палітэхнічны інстытут
паведамляе, што ўсе падаўшыя заявы для паступленьня ў інстытут
пяцівны ськіяцца для трыманьня іспытаў 15 жніўня ў 8 гадзін раніцы, у памяшканьне хэмікатэхналёгічнага факультэту—Менск, Замкавы завулак.
Неадпушчаным, да іспытаў паведамленьне кожнаму асобна.
Дырэкцыя.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ПАДПІСЧЫКАЎ.
Гэтымі днямі выходзіць з друку часопіс
„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"
орган ЦК КП(б)Б
№ 8
за чэрвень 1933 г.
ЗЬМЕСТ:
Пастанова Сакратарыяту ЦК аб рэарганізацыі часопісі «Бальшавік Беларусі».
Перадавы.—Уборцы і здачы прадукцыі дзяржаве—бальшавіцкія тэмпы.
СЛОНІМ.—Торфазмія ў другой пяцігодцы.
СТАЛЕВІЧ.—Даш выніку за 13 год.
Х. Р.—Да выніку 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.
ЗАЛЕСКІ.—Да пытаньня аб арганізацыі працы ў зярніц уборкі.
ЗЛОТКІН.—Аб перабудове партыйнай арганізацыі ў вёсцы.
РОСЬЛІН.—З вопыту работы пасобных палітаддзелаў.
ФРОЛАЎ.—Гарадоцкі палітаддзел пачаў перабудоўваць партарганізацыю зоны дзейнасьці МТС.
АПЯНІН.—Магілеўскі палітаддзел пачаў перабудоўваць партарганізацыю зоны дзейнасьці МТС.
ТОКЕРА.—З вопыту работы палітаддзелу саўгасу Камсамольскае прадпр.
НІШТЫМАЎ.—З баразьбы Шыпоўскай партарганізацыі за сяўбу.
КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ.
БАЙЦІЧ.—Узмоцнім клясавую пільнасьць супроць буржуазнай тэорыі дзяржавы і права. (Пра работу Галаўзы—«Псыхалёгічная тэорыя права і марксызм»).

Умовы прыёму ў інстытут ас